Ірына Данеўская

# БАГУСЛАЎ РАДЗІВІЛ

## Генерал караля

*З украінскай*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2020

УДК 821.161.2
ББК 84(4Укр)-44
Д17

Пераклад з украінскай Наталкі Бабінай паводле выдання:
Даневська І. Богуслав Радзивіл: Генерал короля.
Київ: Темпора, 2017.

Мастак Мікола Койдан

**Данеўская, І.**
Д17 Багуслаў Радзівіл: Генерал караля / Ірына Данеўская ; пер. з укр. Н. В. Бабінай. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2020. — 582 с.
ISBN 978-985-7210-37-4.

У гістарычным рамане-эпапеі «Багуслаў Радзівіл. Генерал караля» апісваюцца крывавыя падзеі 1648—1655 гадоў, калі ўкраінскія, беларускія, польскія, літоўскія і малдаўскія землі ахапілі шматлікія збройныя канфлікты, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «Патоп».

Бесклапотны шукальнік прыгод Багуслаў Радзівіл становіцца генералам войска Рэчы Паспалітай, а яго стрыечны брат Януш узначальвае ўзброеныя сілы Вялікага Княства Літоўскага. Непераможны да гэтых пор украінскі гетман Багдан Хмяльніцкі церпіць балючыя паражэнні ў гучных бітвах з удзелам Радзівілаў. Што далей — пераможа сіла амбіцый ці непрымірымыя ворагі здолеюць дамовіцца між сабой?

**УДК 821.161.2**
**ББК 84(4Укр)-44**

**ISBN 978-985-7210-37-4**

© Даневсьска І., 2017
© Темпора, 2017
© Бабіна Н. В., пераклад на беларускую мову, 2020
© Афармленне, выданне на беларускай мове.
Выдавец А. М. Янушкевіч, 2020

Частка 1

# НЯЧЫСТАЯ СІЛА

Раздзел 1

# СУСТРЭЧА З Д'ЯБЛАМ

*Дзядзілаў*
*(кастрычнік 1648 года)*

У той час, калі Еўропа ўжо складала зброю, якая добра-такі затупілася ў грозных бітвах Трыццацігадовай вайны, і звяртала стомлены погляд на Вестфалію, дзе ў каталіцкім біскупстве горада Мюнстэра нараджаўся жаданы мір, на ўсходзе, дзе сівыя хвалі Дняпра здаўна абмывалі нявольніцкімі слязьмі парогі Крымскага ханства, усё жывое ўзялося за зброю і сышлося ў баях не на жыццё, а на смерць. Аднак казацкае паўстанне, якое лютым полымем ахапіла Украіну*, закранула Валынь, Падолле, Літву і лізнула крывавым языком ускраіны Рускага ваяводства**, яшчэ не дакацілася да Прыкарпацця, і тут пакуль што панаваў падманлівы спакой, які звычайна папярэднічае лютай буры.

Стаяла слаўная спакойная восень. Тою парой, калі дзень ужо падыходзіў да канца, густую вячэрнюю цішыню залаціста-зялёных далін і ўзгоркаў парушылі гучны тупат капытоў і нецярплівае конскае ржанне. А зусім хутка са змрочных лясных нетраў на свет божы выехаў невялікі атрад вершнікаў, з выгля-

* Украінай у XVII стагоддзі называлі землі Кіеўскага, Брацлаўскага і Чарнігаўскага ваяводстваў Рэчы Паспалітай.

** Рускае ваяводства Рэчы Паспалітай у XVII стагоддзі складалася са Львоўскай, Галіцкай, Пярэмышльскай, Холмскай і Сяноцкай зямель.

ду шляхціцаў. Трапяткое святло амаль патухлага дня пазалаціла іх насцярожаныя твары і грозна блiснула сталлю баявых даспехаў: падарожжы і ў мірны час былі небяспечнай неабходнасцю, а ў ваеннае ліхалецце і пагатоў. Вёў атрад ужо немалады чалавек, хоць і шляхціц, але занадта простага выгляду, каб яго можна было прызнаць за старэйшага. Побач з ім ехаў малады чалавек дваццаці шасці гадоў — сярэдняга росту, моцнага целаскладу, з добрым позіркам блакітных вачэй на расчырванелым ад ветру і доўгіх падарожжаў твары, мілавіднасці якога не псавалі нават трохі завялікі нос і рабаватая скура — вынік перанесенай яшчэ ў дзяцінстве воспы. Ён быў таксама апрануты па-дарожнаму: у просты шэры кафтан з доўгім радам цынавых запон* і кунтуш з ласінай скуры, з-пад якога пабліскваў баявы нагруднік. Толькі абшытая куніцай квадратная шапка-рагатоўка, якую падарожнік насунуў на лоб, пояс — скураны, багата пакрыты срэбнымі пласцінамі з турэцкай бірузой, турэцкая шабля са срэбнай рукаяткай у срэбрам жа ўбраных похвах, добры конь у багатай збруі і ўладная рыцарская пастава выдавалі ў ім галоўнага сярод таварыства. Выехаўшы наперад, малады шляхціц з трывогай агледзеўся і аж расцвіў, убачыўшы перад сабой пракладзеную людзьмі і скацінай дарогу.

— Ну, Даніловіч, такі вывеў на шлях! — весела крыкнуў ён старэйшаму таварышу. — А як бадзяліся мы ў лясных гушчарах, то я ўжо падумаў, што ты нас на той свет завесці хочаш.

— Я гэта месца, пан Нямірыч, як свае пяць пальцаў ведаю, — задаволена адазваўся шляхціц. — Калі б не зрэзалі напрасткі праз лес трохі дарогі, то да Дзядзілава** хіба раніцай дабраліся б.

Стэфан — так звалі пана Нямірыча — не сумняваўся ў сваім праваднiку, таму ўдзячна кіўнуў, але хтосьці з яго людзей усё ж не ўтрымаўся ад жарту:

— А можа, Даніловіч, ты нас у госці да Хмяльніцкага вядзеш?

* Алавяных зашпілек.

** Дзядзілаў (укр. Дзідылаў) — цяпер сяло ў Каменка-Бугскім раёне Львоўскай вобласці.

— Ды хоць бы і так! — фыркнуў Даніловіч. — Хто такі гэты Хмяльніцкі, якога вы, паны, так баіцеся? — і сам жа і адказаў: — А ніхто. Пісар казацкі, у якога сусед адабраў хутар, забраў палюбоўніцу і сына трохі розуму павучыў... Прыязджаў ён на сойм скардзіцца, дык там яму добранька патлумачылі, што да чаго. Падціснуў ён хвост, як хорт паганы, і адправіўся на Сеч мужыкоў бунтаваць.

— Яшчэ і пагалоску пусціў, што яму сам кароль наказаў шаблямі праўды дабівацца, — дадаў нейкі пан — такі тоўсты, што ў яго беднага каня аж ногі падгіналіся пад цяжарам вершніка.

— Хлусіць?!

— Хлусіць! Можа, і дабіваўся ён да караля, але яго, напэўна, выпхалі ў шыю. Але паколькі казакі на Сечы любяць казкі слухаць — то і прыдумаў Хмель, нібыта сам кароль мужыцкі бунт блаславўляе, каб быдла ахвотней за шаблі хапалася.

— Разбойнік! — крыкнуў Даніловіч. — Бунтаўшчык! Як Налівайка, Паўлюк і падобныя ім. І лёс яго такі самы будзе!

— А ты, ойча, чаго маўчыш? — спытаў тоўсты шляхціц у папа, які невядома як апынуўся ў іх кампаніі.

— Дык што ж казаць, сын мой? Казакі абараняюць веру праваслаўную, таму лаяць іх мне неяк не выпадае. Ды і зноў-такі, праўда на іх баку...

— Ты, поп, брашы, ды меру знай! — пагрозліва крыкнуў таўстун.

— Брэшуць сабакі, шаноўны пане, а я слуга божы! Паны абіраюць сваіх сялян так, што толькі душы ім застаюцца, і тое толькі таму, што іх нікому не прадасі. І дабро б самі паны, а то жыды, якім яснавяльможныя свае маёнткі ў арэнду аддаюць. Пан свае грошы мае, а жыду і сабе трэба карысць атрымаць. Вось ён з простага чалавека апошнюю шкуру і цягне, прымушаючы адрабляць паншчыну ці не шэсць дзён у тыдзень... Самі ведаеце, што праўду кажу, — усюды ў Рэчы Паспалітай аднолькавыя парадкі! Жыды гарэлку гоняць і мужыкам прадаюць... Не хочаш піць — то плаці адступное. Дайшло да таго, што і ключы ад цэркваў у жыдоўскіх руках. Хочаш дзіця ахрысціць або павянчацца — плаці. А як хлопу гэта не даспадобы, то хай наракае на сябе, бо пан яго і без суда можа забіць, нават за дробную правіннасць...

— Казакі скардзяцца, што яны каралю патрэбныя, калі на вайну трэба ісці, — дадаў пан Нямірыч, бо, быўшы арыянінам*, лічыў за лепшае не ўмешвацца ў рэлігійныя спрэчкі. — На мора ім хадзіць нельга, а калі мір, то казак — ужо і не казак, а нявольнік: дзесяціну і павалоўшчыну** плаціць, паншчыну адрабляе. А рэестравыя сваёй платы ўжо гадоў пяць не бачылі.

— А унія?*** — узрадаваўся нечаканай падтрымцы поп.

— А што? Што табе унія? — зароў тоўсты шляхціц. — Служы сабе службу па праваслаўным каноне, толькі Папу не забудзься ўспомніць. Унія... Гэта ўсё ваш патрыярх людзей каламуціць! Не выпадае, бачыш, яму схіліцца перад Святым Прастолам. А што да казакоў — панове, то хто ж будзе рабіць паншчыну, калі ўсё быдла ваяваць пойдзе?

— Вось і ваюе, — уздыхнуў Даніловіч. — Ці то так добра ваюе, ці то Рэч Паспалітая аслабла і сыходзіць на нішто, калі шляхта ад аднаго казацкага імені ўцякае? А нам, панове, адно

* Арыяне — прыхільнікі арыянства, плыні ў хрысціянстве, якая існавала ў IV—VI стагоддзях у Александрыі. Назва паходзіць ад імені Арыя (256—336) — святара з Александрыі. У Рэчы Паспалітай у канцы XVI — першай палове XVII стагоддзя арыянства трансфармавалася ў сацыніянства (па імені філосафа Фаўста Соцына). Яго паслядоўнікі называлі сябе «ўнітарыямі» (лац. *Unitarii*) або «польскімі братамі» (лац. *Fratres poloni*), але ў народзе былі вядомыя як арыяне. Сацыніяне лічылі, што крыніцай ісціны з'яўляецца Святое Пісанне, але толькі тады, калі яно не супярэчыць розуму і здароваму сэнсу; адмаўлялі дагмат Тройцы; сцвярджалі, што Ісус Хрыстос быў чалавекам. Адмаўлялі існаванне першароднага граху і наогул псаванне маральнай прыроды чалавека праз грэхападзенне першых людзей; не прызнавалі сакрамантаў, малітваў за памерлых, культу святых, абразоў, адпрэчвалі ўсю знешнюю царкоўную абраднасць; шанавалі суботу.

** Павалоўшчына — падатак у памеры ад 4 да 60 грошаў і больш са двара ў залежнасці ад стану сельскай гаспадаркі — колькасці і якасці зямлі, наяўнасці рабочай скаціны і т. п. Дзесяціна — падатак на карысць цэркваў, манастыроў і духавенства.

*** Берасцейская унія (ад лац. *unio* — «саюз») — рашэнне Кіеўскай мітраполіі разарваць на тэрыторыі Рэчы Паспалітай адносіны з Канстанцінопальскім патрыярхатам і аб'яднацца з апостальскай сталіцай на ўмовах падпарадкавання Папу Рымскаму, прызнання асноўных каталіцкіх догмаў і захавання праваслаўнай абраднасці. Унію фармальна і афіцыйна абвясцілі ў 1596 годзе на царкоўным саборы ў Берасці.

каб языкамі малоць. Яшчэ і кроў не высахла па пілявецкім пагроме, як зладзілі элекцыю.

— Не кажы, Даніловіч, — сказаў Нямірыч. — Для казакоў кароль як пан бог на небе. Будзем спадзявацца, што хоць яго слухаць будуць, хай мы яго толькі абяром...

Змоўклі. Звілістая рака Думна весела пятляла паміж крутых берагоў, аднак абрывісты шлях не весяліў стомленых падарожнікаў. Цяжка ішлі стомленыя коні, і сонна хіліліся на грудзі галовы коннікаў.

— Ого! — раптам спалохана крыкнуў хтосьці з чэлядзі. — Папялішча наперадзе. Няўжо і тут казакі пабывалі?

Наперадзе сапраўды чарнелі разваліны нейкага замка. Сон, які да гэтага часу склейваў павекі Нямірыча, імгненна прайшоў.

— Усё ж завёў ты нас, пан Даніловіч, у нейкае кепскае месца, — устрывожыўся ён, аглядаючыся вакол. — Ці не ваўкам на вячэру?

— Лепш да ваўкоў, чым на казацкія шаблі, — змрочна сказаў Даніловіч і, заўважыўшы вялікую занепакоенасць таварыша, дадаў: — Баяцца не варта. Той замак туркі разбурылі яшчэ трыццаць гадоў таму. Ужо і да Дзядзілава недалёка.

Усе з палёгкай уздыхнулі. Стэфан гучна здзівіўся халатнасці Сабескіх, цяперашніх гаспадароў Дзядзілава.

— Гэта праклятае месца, — растлумачыў Даніловіч і набожна перахрысціўся. — Прайсці б яго да цемры. Але ўжо не атрымаецца, бо змярканне на зямлю кладзецца.

— Гэта чаму? — здзівіўся Нямірыч. — Няўжо на самай справе можам натрапіць на казацкую засаду? Але ж Ян Сабескі казаў, што ў яго ўладаннях спакойна.

Замест адказу яго таварыш прышпорыў каня, жадаючы як мага хутчэй абысці злавесныя руіны. Стэфан зрабіў гэтак жа.

Хутка з вячэрняй цемры паказалася мястэчка. Але ўзрадавацца гэтаму вандроўнікі не паспелі, таму што дарогу ім перагарадзілі нейкія коннікі.

— Ану стой! Хто едзе? — крыкнуў адзін з іх.

— А ты хто такі? — спытаў Нямірыч.

— Гэта не адказ, — грозна адазваўся той. — Адказвай, бо спытаю з пістоля!

Пасля гэтых слоў з-за дрэў выступілі ўзброеныя да зубоў людзі, і, хоць цэліліся ў іх з самапалаў, Нямірыч з палёгкай выдыхнуў, таму што на казакоў яны ніяк не былі падобныя.

— Я — Нямірыч, кіеўскі крайчы*, — паведаміў Стэфан. — Някепска ж ва ўладаннях майго добрага таварыша Яна Сабескага гасцей сустракаюць! Хто тут за старшага?

Шляхціц, што гарцаваў наперадзе, заткнуў пістоль за пояс і зрабіў знак сваім людзям апусціць зброю.

— Прабач, пан Нямірыч, — сказаў ён. — Я — Грынкоўскі, дзядзілаўскі староста.

— Вітаю, пан староста, — сказаў Нямірыч, злазячы з каня. — А чаго гэта ты і твае людзі нібы на вайну сабраліся? Няўжо і ў тутэйшых землях казакі бясчынствуюць?

— Бог мілаваў, — уздыхнуў той і, таксама спешыўшыся, падышоў да Стэфана і ветліва пацiснуў працягнутую руку. — Толькі вось з'явіўся ў нашых землях нейкі прывід. Як надыдзе ноч, блукае чорным ценем, мужыкоў палохае ды дзяўчат гвалціць. А на досвітку бясследна знікае.

Нямірыч здзіўлена міргнуў.

— Так-такі й бясследна? — не паверыў ён.

— Не зусім, — паправіўся староста. — Кожны раз пакідае пасля сябе чорную стралу.

— Святая дзева! — ускрыкнуў Даніловіч і са страхам пагледзеў на разваліны замка. — Гэта ж сапраўды сам Д'ябал бясчынствуе. Кажуць жа людзі, што яго душа тут гуляе!

— Шчырая праўда, — пацвердзіў Грынкоўскі. — Я сам яго бачыў некалькі гадоў таму: ён стаяў на папялішчы ўвесь заліты месячным святлом, а яго чорную вопратку развяваў вецер. Я як глянуў, так адразу як нежывы з каня і грымнуўся. Каб не абраз Найсвяцейшай Панны Чэнстахоўскай, што на шыі вісеў, то, на-

* Крайчы — палацавая пасада. У функцыі крайчага ўваходзіла падрыхтоўка балю: размясціць стравы на стале, пакаштаваць іх і падаць.

пэўна, не стаяў бы тут перад вамі. А так святая дзева абараніла, таму раніцой у сябе прыйшоў.

Жаўнеры, якія таксама чулі гэтую размову, усхвалявана зашапталіся. Хтосьці стаў чытаць малітву.

— І хто ж такі гэты д'ябал? — здзіўлена спытаў Нямірыч. — Я нешта не чуў пра такога.

— Нябожчык пан Станіслаў Стадніцкі, былы гаспадар гэтых зямель, — растлумачыў Грынкоўскі. — Страшны быў чалавек, хай неба супакоіць яго грэшную душу. У падзямеллі ланьцуцкага* палаца — сваёй галоўнай рэзідэнцыі — трымаў засценак для катаванняў. Мала хто з яго ворагаў выйшаў адтуль жывым, а хто і выходзіў, то траціў розум ад нечалавечых пакут. Пасля таго як д'ябальскія злачынствы перапоўнілі чашу цярпення караля, выехаў ён з Ланьцута і пасяліўся тут, у Дзядзілаве, на вялікі страх сваім суседзям.

— «Д'ябал» — гэта імя пана Станіслава пры хрышчэнні, — умяшаўся Даніловіч. — Яго бацька быў кальвіністам, а маці каталічкай, таму яна і вырашыла таемна сына каталіком ахрысціць. Але напрыканцы цырымоніі ў касцёл уварваўся раз'юшаны пан Матэуш Стадніцкі, і ксёндз так перапалохаўся, пабачыўшы яго, што замест імені малога памянуў нячыстага.

Нямірыч зарагатаў.

— Якіх толькі казак не пачуеш у нашай Рэчы Паспалітай! — усклікнуў ён. — Ды пры чым жа тут чорная страла?

— Ну як жа? — Грынкоўскі асуджальна пахітаў галавой, дзівячыся такой неабазнанасці. — Перад тым як напасці, Д'ябал пасылаў да абранай ахвяры чорную стралу. Гэта быў знак, што раніцай прыбудзе сам для рабавання і разбою.

— Нешта гэты Д'ябал пасля смерці адвагі пазбавіўся, — задумаўся Нямірыч. — Раней і стралу загадзя пасылаў, і днём набегі рабіў. І з дзеўкамі забаўляцца нябожчыку не выпадае... Упэўнены, што і ты, пан, так думаеш, таму што зараз не з крыжам, а з мушкетамі на нячыстую сілу палюеш.

* Ланьцут — горад у Падкарпацкім ваяводстве Польшчы.

— Ды ксёндз ужо хадзіў тут з малітвамі, — засмяяўся Грынкоўскі. — Толькі яны не вельмі падзейнічалі. То я і падумаў, можа, добрая шабля і куля лепш нашай бядзе дапамогуць?

— Мудры ты чалавек, пан староста, — таксама ўсміхнуўся Стэфан. — Хоць я спачатку і засумняваўся, калі ты мяне казачкай пра прывідаў палохаць пачаў. Таму, як маёй дапамогай не пагрэбуеш, давай разам на тую здань паляваць.

Пан Грынкоўскі з радасцю на гэта пагадзіўся, а вось жаўнеры Нямірыча зусім не ўзрадаваліся. Злавесна прагучаў аповед пра Д'ябла, і руіны замка наводзілі на жудасныя думкі, але ўсё ж сорамна было здацца баязліўцамі... Таму, заехаўшы ў мястэчка і запіўшы страх дзядзілаўскім мёдам, шляхта ціхенька села ў засаду недалёка ад таго месца, дзе апошні раз бачылі «Д'ябла», не забыўшыся акрапіць сябе святой вадой.

Ноч была цёмная, хоць вока выкалі. І пранізлівы восеньскі холад пачаў даймаць. У Нямірыча ўжо і зуб на зуб не трапляў.

— Можа, да чорта яго, гэтага прывіда? — падумаў ён, і тут, нібы ў адказ, пачулася ціхае ржанне коней, а крыху пазней наблізіўся вялікі чорны цень. Ён лёгка перамахнуў праз высокі драўляны частакол, які атачаў мястэчка.

— Прывід! — не на жарт перапалохаліся «паляўнічыя». — Ланьцуцкі д'ябал! Маці божая, абарані і выратуй нас! — раздаліся галасы.

Ваякі сабраліся ўжо бегчы прэч, пакінуўшы свайго камандзіра сам-насам з госцем з таго свету, але Стэфан здолеў своечасова павярнуць каня і адрэзаць баязліўцам шлях да ўцёкаў.

— Вы з глузду з'ехалі, панове, зусім падурэлі? — крыкнуў ён. — Ды праваліцца мне на гэтым месцы, калі гэта не чалавек з плоці і крыві! І ідзе проста нам у рукі... Ану стой!

А прывід, убачыўшы, што трапіў у пастку, кінуўся наўцёкі. Спрытна залез на дрэва, пераскочыў цераз частакол і знік за ім. А яшчэ праз імгненне начную цішыню працяў злавесны рогат. То смяяўся «Д'ябал».

— Уцячэ ж, уцячэ! — крыкнуў, падбягаючы, Грынкоўскі, што хаваўся непадалёк са сваёй чэляддзю. — От сцерва!.. Каня дайце! Каня, чорт пабяры!

— Давай на майго, — прапанаваў тоўсты таварыш Нямірыча, якому моцна не хацелася звязвацца з нячыстай сілай.

Грынкоўскі ўскочыў на яго рабога огера і панёсся да брамы, за ім — Стэфан, Даніловіч і тыя іх людзі, якім хапіла смеласці. Папярэджаныя крыкамі вартавыя адчынілі вароты, і пагоня з шумам і свістам знікла ў ночы.

За час сядзення ў засадзе вочы Нямірыча прывыклі да цемры, і ён адразу заўважыў «прывіда», што ляцеў наперадзе на белым жарабцы. Услед за «Д'яблам» чорнымі ценямі мчаліся яго людзі.

— Цьфу ты! — аж сплюнуў Даніловіч. — Звычайнюсенькі разбой, а я ўжо чорт ведае што падумаў!

Разбоі і заезды былі звычайнай справай у Рэчы Паспалітай, бо моцная рука важыла тут больш, чым закон. Пан Стэфан добра разбіраўся ў такіх штуках, бо быў даўняга руска-літоўскага роду, а яго багатыя маёнткі на Кіеўскім Палессі, Валыні і Белай Русі, вядома, не давалі спакою многім зайздроснікам. Самым небяспечным сярод іх быў сумна вядомы Самойла Лашч, які сваёй злой славай мог параўняцца хіба што з нябожчыкам ланьцуцкім Д'яблам, чыю маску начапіў на сябе невядомы дзядзілаўскі жартаўнік. Думка пра тое, што гэтым жартаўніком мог быць менавіта каронны стражнік, які пасля смерці свайго высокага заступніка гетмана Канецпольскага, дрыжучы за сваю шкуру, невядома дзе дзеўся, падганяла цяпер Нямірыча, прымушаючы прышпорваць каня, які і без таго мчаўся як вецер. І сапраўды, хто мог бы так жартаваць, акрамя славутага разбойніка, што насіў на сабе кажух, падбіты дзвюма сотнямі інфамій і баніцый*, у якім нават неяк заехаў на каралеўскі двор?..

Пастулова адлегласць паміж разбойнікамі і пагоняй пачала скарачацца. Адзін з уцекачоў, павярнуўшыся, стрэліў, і Даніловіч упаў на зямлю, не паспеўшы і Госпада згадаць.

* Баніцыя — мера пакарання ў Рэчы Паспалітай. Для шляхціца выражалася ў пазбаўленні гонару. Інфамія — яшчэ мацнейшая мера пакарання, што ўжывалася да шляхты за самыя цяжкія злачынствы — разбой, крадзеж, гвалт. Асуджаны траціў гонар і добрае імя, не мог займаць пасад, якія патрабавалі даверу, і часткова выводзіўся з-пад нормаў судаводства.

— Ах ты суччын сын! — усклікнуў Стэфан і таксама наўздагад стрэліў з пістоля, нават не прыцэліўшыся як след.

Конь, які нёс на сабе «Д'ябла», стаў на дыбкі і пранізліва заржаў. А потым раптам упаў як падкошаны, падмяўшы пад сябе вершніка, і забіўся ў агоніі. Пагоня пераможна закрычала.

Да здзіўлення Нямірыча, іншыя «д'ябаляты» нават не паспрабавалі дапамагчы свайму пану. Клапоцячыся пра ўласны лёс, яны панесліся далей і зусім хутка растварыліся ў начной цемры. Але праследнікам ужо было не да іх.

— Што, папаўся, лайдак? — прахрыпеў Стэфан, саскокваючы з каня і нахіляючыся да «прывіда», які ляжаў на зямлі і цяжка дыхаў. — Дайце хто агню! Хачу лепш разгледзець гэтага дэмана.

Падалі запалены факел, і Стэфан разглядзеў прыгожы твар разбойніка, які, крыва ўсміхаючыся, пазіраў на яго. Чорныя пранізлівыя вочы свяціліся ў цемры, як два вугольчыкі.

— Гэта не Лашч! — з прыкрасцю выдыхнуў Нямірыч.

— Не, пане, не Лашч, — насмешліва адазваўся разбойнік, з цяжкасцю паднімаючыся і крывячыся ад вострага болю ў разбітай назе. — Я бачу, ты, шляхціц, прыняў мяне за іншага, таму я дарую табе тваю памылку.

— Ты даруеш мне! — усклікнуў Стэфан, у якога і вушы запалалі ад такой дзёрзкасці.

— Так, — кіўнуў «Д'ябал», аглядаючыся вакол. — А хай цябе, шляхціц, шляк* разаб'е! — скрозь зубы працадзіў ён, натрапіўшы поглядам на свайго мёртвага каня. — Чым перад табой правінілася бедная жывёла, што ты ляцеў за ёй у такую далеч, каб падстрэліць? Чаго маўчыш?! Адказвай, калі пытаюць.

Нямірычу яшчэ не даводзілася сустракацца з такімі нахабнікамі.

— Гэта ты, нягоднік, будзеш перад судом адказваць за разбой, — агрызнуўся ён.

— Як дажыве, — злосна кінуў Грынкоўскі, падыходзячы бліжэй. — Таму што мне аж рукі свярбяць павесіць яго на ву-у-унь той галіне.

* Радыкуліт *(размоўнае)*.

Разбойнік таксама паглядзеў на таўшчэзную дубовую галіну, на якую паказваў Грынкоўскі, і незадаволена зморшчыўся.

— Прабач, пане, але яна мне нешта не падабаецца.

— Ды ты што? — ухмыльнуўся пан староста. — Ну, выбірай іншую, на свой густ.

— Добра, — лёгка пагадзіўся нахабнік. — Ды каб не губляць часу, адразу скажу, што ў гэтым лесе такіх няма.

Шляхта зарагатала. Грынкоўскі нахмурыўся.

— Будзеш з чарцямі ў пекле жартаваць, суччын сын, і то хутка! Я табе...

— І з імі пажартую, калі надасца магчымасць. Аднак спадзяюся, што гэта не хутка будзе. Пратры вочы, шляхціц, або пасвяці сабе і лепш разглядзі, з кім гаворыш.

Нямірыч ужо паспеў разглядзець і багатае ўбранне разбойніка, і каштоўную вупраж на мёртвым кані... Ды і конь быў такі, што сам кароль не пасаромеўся б сесці.

Грынкоўскі трохі разгубіўся.

— Бачу, што высокага палёту ты птушка, хоць і не з нашых краёў, — асцярожна сказаў ён, усё ж панізіўшы голас. — Дык якога ж ты нячыстага, яснавяльможны пане, мірных людзей палохаеш?

Гэтыя прымірэнчыя словы слугі, а не гаспадара, падзейнічалі на «Д'ябла» як гаючы бальзам на крывавую рану.

— Да вашых краёў я прыехаў па справах, а наслухаўшыся тут казак пра свайго цёзку — тутэйшага Д'ябла, вырашыў трохі пажартаваць, — фанабэрыста кінуў разбойнік. — Здаецца, атрымалася, таму што святар так упарта нячыстую сілу з Дзядзілава выганяў, што я, назіраючы гэтую камедыю, ледзьве не лопнуў ад смеху.

— А дзевак навошта гвалтаваў? — не сціхаў Грынкоўскі.

— На тое была прычына.

— Якая ж?

— Захацелася.

Староста так і застыў з адкрытым ротам. Супраць такой «паважнай прычыны» сапраўды цяжка было нешта запярэчыць.

— Бачу, пане «Д’ябал», што ты чалавек вясёлы, — умяшаўся Нямірыч, якога моцна абурыла такое блюзнерства. — На мой *humor** таксама ніхто яшчэ не скардзіўся. То што, паспрабуем разам павесяліцца?.. Ну, хлопцы! — міргнуў ён сваім людзям.

Не паспеў разбойнік апамятацца, як быў скручаны па руках і нагах.

— Добра, — усміхнуўся Нямірыч, назіраючы за адчайнымі спробамі ворага вызваліцца. — А цяпер прывяжыце яго да гэтай здыхляціны, — ён штурхнуў нагой мёртвага каня, — і хай скача здаровы на ўсе чатыры бакі! Ну што, ліхадзей, як табе мой жарт? — пацікавіўся ён, калі чалядзіны выканалі яго загад.

— Ты... ты, мярзотнік, вырашыў пакінуць мяне ваўкам на з’ядзенне? — «Д’ябал» ужо задыхаўся пад цяжарам конскай тушы. — Лепш прыстралі мяне!

— Ты мяне ка́там лічыш? — абурыўся Стэфан. — Бывай здаровы, пане, і дамаўляйся неяк з ваўкамі, таму што яны, як і ты, сатанінскага роду.

— Вазьмі выкуп, — дзелавіта прапанаваў разбойнік, аднак Нямірыч, ускочыўшы на каня, толькі памахаў яму рукой. Грынкоўскі з ваярамі, рагочучы, рушылі следам.

Але ад’ехалі недалёка, Стэфан спыніўся і прыслухаўся.

— Маўчыць? — здзіўлена спытаў ён, так і не пачуўшы чаканых заклікаў да міласэрнасці. — Я наўмысна яму рот не завязаў, думаў, што будзе маліць аб літасці.

— Маўчыць, — пацвердзіў Грынкоўскі. — Ну, сатана!

Пачакалі яшчэ трохі, але дарэмна. Ужо і світаць пачало.

— Трэба вяртацца, — расчаравана ўздыхнуў Нямірыч.

— Не, — адрэзаў староста, з надзеяй прыслухоўваючыся да далёкага выцця ваўкоў. — Будзе яшчэ мне зубы шчэрыць. Хай падыхае, сабака!

— А можа, ён ужо таго? — сказаў нехта з жаўнераў.

— Чаго?

— Ну... дуба даў ад пераляку.

* Характар *(лац.)*.

Занепакоены Стэфан, нягледзячы на пратэсты Грынкоўскага, павярнуў каня і панёсся назад. Але разбойнік быў жывы. Убачыўшы Нямірыча, ён так паглядзеў на яго, нібы хацеў спапяліць на месцы.

Стэфан моўчкі перарэзаў вяроўкі і загадаў чэлядзі адсунуць убок мёртвую жывёлу. Шляхціц устаў. Ён ужо не жартаваў. Са змрочнай нянавісцю агледзеў прысутных, быццам збіраўся навек захаваць іх аблічча ў памяці.

Нямірыч паказаў яму на каня нябожчыка Даніловіча.

— Ты храбрэйшы за сваіх людзей, — сказаў ён. — Едзь адсюль і больш не вяртайся.

— Я ім падзякую пры выпадку, — паабяцаў той, сядаючы ў сядло. — І вам, панове, таксама!

— Ты што, пан крайчы, здурнеў, што адпускаеш гэтага разбойніка? — падскочыў Грынкоўскі. — Я яго ў суд...

— Адкупіцца, — абыякава махнуў рукой Стэфан. — Можаш яго спыніць, калі хочаш.

Грынкоўскаму гэтая прапанова не спадабалася, таму ён толькі суха кіўнуў «Д'яблу»:

— Бывай! Каб я цябе больш не бачыў!

Той усміхнуўся — люта і злосна.

— Нават не спадзявайся, пан староста. Гэта гара з гарой не сыходзіцца, а мы з табой, дасць бог, яшчэ сустрэнемся. І з табой таксама, — ён падміргнуў Нямірычу. — Да сустрэчы, панове, да хуткай сустрэчы!

Ён крута развярнуў каня і панёсся прэч.

— Ну што, едзем? — Нямірыч азірнуўся на Грынкоўскага.

— Паехалі, — злосна буркнуў той, пераканаўшыся, што варожую постаць ужо паглынуў перадсвітальны туман. — Толькі збрую з мерцвячыны здыму. Шкада такому дабру прападаць!

Стэфан абыякава глядзеў, як шляхціц важдаецца каля конскага трупа. І раптам нечаканая думка падкінула яго на месцы:

— Ох я і дурань! Нават імя яго не спытаў!

— Я таксама пра гэта толькі зараз падумаў, — змрочна сказаў дзядзілаўскі староста. — Дзіравая галава...

— Не хвалюйся, — засмяяўся Стэфан. — Цябе ж ён ведае.

— То-та і яно! Ды трасца яго мацеры... Пан Нямірыч, а паглядзі-ка сюды.

Той паглядзеў і здзіўлена свіснуў: на падвесцы да конскай збруі грозна зіхацелі золатам радзівілаўскія трубы*.

* Тры паляўнічыя трубы ў залатой аправе на блакітным шчыце намаляваныя на гербе Радзівілаў — самага багатага і магутнага роду Вялікага Княства Літоўскага.

Раздзел 2

# ЭЛЕКЦЫЙНЫ СОЙМ

*Варшава*
*(кастрычнік 1648 года)*

Элекцыйны сойм, на які спяшаўся пан Нямірыч, пачаўся каля Варшавы яшчэ ў канцы верасня, і ўжо задоўга да гэтага дня сталіца Рэчы Паспалітай ператварылася ў кіпячы кацёл, дзе бурна віравалі жарсці вакол элекцыі новага караля. Вострага прысмаку ім дадаваў шэраг цяжкіх паражэнняў польскіх войскаў ад казацкіх паўстанцаў. Корсунь, Жоўтыя Воды і асабліва Піляўцы, з-пад якіх шляхта ўцякла, нават не прыняўшы бою, кінулі ганебны цень на велізарную дзяржаву, што раскінулася ад Балтыкі да Чорнага мора. Еўрапейскія манархіі, якія яшчэ нядаўна з жахам глядзелі на ўсход, маглі з палёгкай уздыхнуць: калос стаяў на гліняных нагах і штосекунды мог абрынуцца, не вытрымаўшы ўласнай велічы.

У пачатку кастрычніка галоўны віноўнік шляхецкіх бед і няшчасцяў, казацкі гетман Хмяльніцкі, ужо стаяў з усім войскам пад Львовам, усяго за некалькі соцень міль* ад сталіцы, і такое небяспечнае суседства зусім не спрыяла падняццю духу вяльможнага панства, якое ніяк не магло вырашыць, што рабіць далей: абіраць караля ці бегчы куды вочы глядзяць. Пакуль ішлі спрэчкі, казацкі гетман паспеў узяць са Львова велізарны выкуп

* Польская міля была роўная 8 530 м.

і накіраваў сваё грознае войска прамой дарогай на Люблін і Варшаву. Польская сталіца ляжала перад казакамі безабаронная, і паны паслы, даслаўшы самыя каштоўныя рэчы чоўнамі ў Гданьск, ужо рыхтаваліся паўтарыць свой пілявецкі подзвіг — пакінуць горад на міласць пераможцаў.

Але, відаць, бог вырашыў не дапусціць пагібелі Рэчы Паспалітай, бо Хмяльніцкі дарогай на Варшаву нечакана спыніўся пад багатым Замосцем і, акружыўшы яго ўсім войскам, траціў час на аблогу. Пачуўшы пра гэта, паны паслы трохі супакоіліся. А калі ў сталіцу прыбыў князь Ярэма Вішнявецкі са сваімі людзьмі, яны ўжо зусім прыйшлі ў сябе і, узброіўшыся шляхецкім гонарам, пачалі патроху з'язджацца да вызначанага месца элекцыі, каб нарэшце прыступіць да абрання манарха.

У гэтую няпростую пару дабраўся да Варшавы і Стэфан Нямірыч, ужо зусім забыўшыся пра сустрэчу з дзядзілаўскім сатаной. Дый займацца такімі глупствамі цяпер, калі вырашаўся лёс усёй Рэчы Паспалітай, неяк не выпадала.

* * *

Яшчэ ў той час, калі пан Нямірыч упарта паляваў на «Д'ябла» ў дзядзілаўскіх лясах, памёр адзін з прэтэндэнтаў на польскі трон — князь Юрый I Ракачы, і смерць гэтага мудрага правіцеля выклікала замяшанне сярод яго прыхільнікаў, перш за ўсё польскіх і літоўскіх дысідэнтаў*. Жудасную навіну паведаміў Стэфану яго старэйшы брат Юрый — кіеўскі падкаморы** і галоўны пратэктар арыян усёй Рэчы Паспалітай, што прыбыў у сойм абараняць сваіх братоў па веры, над якімі навісла пагроза выгнання з краіны. Старэйшага Нямірыча вестка пра смерць уразіла ў самае сэрца, бо ён рабіў усё магчымае, каб пратэстант Ракачы

* Дысідэнтамі (лац. *dissidens* — «адступнік») у Рэчы Паспалітай называлі некаталікоў, перш за ўсё пратэстанцкага веравызнання.

** Падкаморы — суддзя ў Рэчы Паспалітай, які займаўся размежаваннямі ўладанняў. Быўураднікам земскага шляхецкага суда.

*absque omni exceptione** перамог сваіх сапернікаў — прынцаў Яна Казіміра і Ка́раля Фердынанда.

— Няўжо нехта з братоў-езуітаў** узыдзе на польскі трон? — Стэфан у роспачы падняў вочы да неба. — Божа, барані нас ад такой бяды!

— Вугорцы прапануюць абвясціць каралём малодшага сына нябожчыка князя Жыгімонта, — цяжка ўздыхнуў Юрый. — Але справа гэта амаль безнадзейная, бо новы семіградскі ўладар зараз больш займаецца султанскім фірманам*** на княжанне, чым польскай каронай для сябе або для брата.

— А што пра яго асобу князь гетман**** Радзівіл кажа? — стрэпянуўся Стэфан. — Бо ён кляўся не дапусціць Вазаў да трона.

— Князь Януш толькі ўчора прыехаў у Варшаву, — адказаў старэйшы Нямірыч. — Амаль усё войска ён пакінуў у Літве змагацца з казацкімі атрадамі, таму на сойм прыбыў з невялікімі сіламі. Пра Жыгімонта абяцаў пагаварыць са сваім сваяком — літоўскім канцлерам Альбрэхтам Радзівілам, але я вялікіх спадзяванняў на згоду не ўскладаю, бо хутчэй ракі засвісцяць, чым пратэстанты з каталікамі знойдуць агульную мову.

Юрый меў рацыю. У Варшаве Нямірычы арандавалі дом на Ратушнай плошчы, дзе жылі пераважна яўрэі. Але нават тут, у бяспечным для ўсіх некаталікоў месцы, часта ўспыхвалі рэлігійныя сутыкненні, якія за часы «бескаралеўя» сталі яшчэ больш

* Без сумневу *(лац.)*.

** Каралевічы належалі да ордэна езуітаў і былі кардыналамі каталіцкай царквы. Каб прыняць удзел у элекцыі, яны выклапаталі ў Папы Рымскага дазвол зняць з сябе царкоўныя абяцанні ў выпадку абрання каралём.

*** Грамата, указ.

**** Гетман — кіраўнік узброеных сіл у Рэчы Паспалітай. Войска Польскага каралеўства ўзначальваў вялікі гетман каронны, войска ВКЛ — вялікі гетман літоўскі. Яны мелі намеснікаў — польных гетманаў. Вялікія гетманы камандавалі ўсімі відамі войскаў і праводзілі ваеннае судаводства з правам смяротнага пакарання падчас вайны, у астатні час іх улада была абмежаваная. У мірны час вялікі гетман звычайна знаходзіўся пры двары, займаўся адміністрацыйнымі пытаннямі і стратэгічным кіраваннем, а польны гетман быў «у полі» (адсюль назва пасады), клапоцячыся пра ахову межаў. У XVII стагоддзі пасаду пажыццёва надаваў кароль; знакам гетманскай улады была булава.

жорсткія і крывапралітныя. Невясёлую размову перапыніў слуга, які паведаміў аб прыбыцці ганца з лістом ад Януша Радзівіла. Літоўскі гетман запрашаў старэйшага Нямірыча хутчэй прыбыць да яго.

— Ага, — сказаў Юрый, прагледзеўшы пасланне. — Здаецца, хутка мы пра ўсё даведаемся...

* * *

У гасцявой зале варшаўскага палаца князя і польнага гетмана літоўскага Януша VII Радзівіла было шумна і людна як ніколі. Самыя ўплывовыя людзі Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства сабраліся на раду, каб вызначыцца з асобай будучага караля. Большасць з іх, вядома, былі пратэстанты, як і сам князь гетман, і значныя радзівілаўскія кліенты*, а таму хацелі пачуць пазіцыю патрона і атрымаць указанні адносна сваіх дзеянняў на сойме. Хапала тут і паважаных арыян. Пан падкаморы і вокам не паспеў міргнуць, як яго згроб у абдымкі ўлюбёнец князя Януша — арыянін Ян Мяржынскі, які кіраваў у літоўскага князя дыпламатычнымі справамі. Дзякуючы пратэкцыі гэтага чалавека шмат польскіх і літоўскіх братоў** трапіла на радзівілаўскую службу.

— Князь Януш якраз размаўляе з літоўскім канцлерам, — паведаміў ён у адказ на пытанне Юрыя і кіўнуў у бок малой гасцёўні, уваход у якую ахоўвалі ўзброеныя вартавыя. — Давядзецца пачакаць.

— Што ж, пачакаем, — спакойна сказаў Стэфан, які, вядома ж, прыбыў разам з братам, таму што той ніяк не мог уседзець дома ў вырашальны для Айчыны час.

* Кліент (ад лац. *cliens* — «залежны чалавек») — шляхціц, які добраахвотна аддаўся пад заступніцтва магната — патрона. Кліентаў называлі ў залежнасці ад іх сацыяльнага рангу або «слугамі» (шляхту малаважнага ўзроўню, якую ўзнагароджвалі за паслугі матэрыяльна), або «сябрамі» (калі гаворка ішла пра знаць, якой магнат аказваў спрыянне ў абмен на адданасць і садзейнічанне).

** У каронных землях арыяне называлі сябе польскімі братамі, у Літве — літоўскімі.

З княжацкіх пакояў сапраўды даносіўся водгук размовы, настолькі бурнай, што гэтага не змаглі схаваць нават тоўстыя каменныя сцены гетманскага палаца. Старэйшы Нямірыч з панам Мяржынскім скрушна ўздыхнулі, таму што добра ведалі пра няпростыя адносіны галавы пратэстантаў — літоўскага польнага гетмана і дбайнага каталіка — літоўскага канцлера. Адкрытую варожасць паміж імі магла прыгасіць хіба пагроза гонару і годнасці радзівілаўскага дому, які абодва прадстаўнікі магутнага роду свята шанавалі. Аднак гаворка ішла пра выбары караля, таму запалены рэлігійным фанатызмам літоўскі канцлер не лічыў патрэбным прыніжацца да палітычнай крывадушнасці і так горача апаніраваў пратэстанцкаму князю, што яго гучныя словы прымусілі пачырванець мімавольных слухачоў гэтай размовы. Князь Януш гаварыў цішэй, аднак у яго кароткіх адрывістых адказах добра чуліся ноткі ледзь стрыманай лютасці, якія для ўсіх знаёмых з выбухным норавам князя гетмана былі занадта трывожным знакам, каб на іх можна было не звяртаць увагі. Аднак князь Альбрэхт не думаў стрымлівацца і працягваў крычаць пляменніку свае пратэсты, з кожным словам усё больш распаляючыся. Стэфан не ведаў блізка князя Януша, але зразумеў, што надоўга яго цярпення не хопіць, і заклапочана азірнуўся на брата. Юрый думаў гэтак жа і зразумеў яго знак.

— Магчыма, лепш паведаміць князю гетману аб нашым прыходзе? — пацікавіўся ён у пана Мяржынскага, які таксама з трывогай прыслухоўваўся да сваркі. — Каб мірныя перамовы бойкай не скончыліся.

— Можа і так, — уздыхнуў пан Ян. — Я зараз далажу.

Ён адважна ўвайшоў у гасцёўню, дзе з яго з'яўленнем на момант усталявалася цішыня, а потым, вызірнуўшы адтуль, махнуў Нямірычам, каб заходзілі.

— Стэфан, пойдзем, — паляпаў Юрый брата па спіне. — Князь гетман чакае.

* * *

Януш Радзівіл, князь Біржаў і Дубінак, быў яшчэ малады чалавек трыццаці шасці гадоў. Высокі, стройны, рудавалосы, даволі прыгожы, ён быў парывісты ў рухах і справах, гарачы сэрцам і востры на язык. Упарты і горды, як сам люцыпар, характарам ён нагадваў ільва: хутчэй памрэ, чым схіліць галаву перад ворагам ці лёсам. У той вечар у яго палацы сабраліся амаль усе прадстаўнікі магутнага радзівілаўскага дому: нясвіжскі ардынат князь Аляксандр Людовік з сынам Міхалам Казімірам, клецкі ардынат Міхал Ка́раль Радзівіл, а таксама Юрый Глябовіч — смаленскі ваявода і муж сястры Януша Катарыны. Побач з князем гетманам стаяў пажылы мужчына, убачыўшы якога, абодва Нямірычы скрывіліся, нібы ад зубнога болю. Гэта і быў князь Альбрэхт Радзівіл — літоўскі канцлер і ўладальнік вельмі багатай Алыцкай ардынацыі* на Валыні, фанатычны каталік, ад якога моцна нацярпеліся і самі Нямірычы, і іх аднаверцы, асабліва ў час бескаралеўя, калі арыяне былі абвешчаны ворагамі Айчыны і толькі заступніцтвам князя Януша не сталі выгнаннікамі.

Князь Альбрэхт сваёй несамавітай постаццю, лупатымі вачыма і доўгім арліным носам на перакапаным маршчынамі твары дужа нагадваў кажана. Цяпер гэтае падабенства ўзмацнялася яшчэ і вопраткай: чорным нямецкім камзолам, адкладным белым карункавым каўняром кашулі і кароткім чорным плашчом, што звісаў, як крылы, за спінай раз'юшанага канцлера.

— Гэта яшчэ віламі па вадзе пісана, што Ракачы ўціхамірыць казакоў з дапамогай туркаў, — горача даказваў ён. — Абяцаць што заўгодна можна, але мы не ведаем, што пра яго элекцыю султан скажа! Яшчэ ў дадатак да казацкага паўстання туркаў сабе

* Ардынацыя — спецыяльны статус землеўладання, згодна з якім увесь сядзібны комплекс пераходзіў у спадчыну да старэйшага сына. Да ўспадкавання ардынацыі жанчыны не дапускаліся; астатнія спадчыннікі маглі прэтэндаваць толькі на маёнткі, якія не ўваходзілі ў ардынацыі, або на грашовую кампенсацыю. Вызначаўся таксама парадак атрымання спадчыны ў выпадку згасання роду ардыната (абавязковай умовай было захаванне цэласнасці маёнткаў ардынацыі, якія забаранялася прадаваць, аддаваць у заклад і да т. п.).

на галаву наклічам... І калі мы ўжо закранулі Хмяльніцкага, які нібыта таксама Ракачы спрыяе, то я табе, пляменнік, скажу проста, што твае «вызваліцелі» нанеслі маім уладанням яшчэ больш шкоды, чым казацкія атрады! Не толькі абрабавалі, але і ледзь не спалілі Пінск! Ці ж на такую дапамогу я спадзяваўся, калі прасіў абараніць мяне ад казакоў?

— Такога няўдзячнага сваяка, як ты, дзядзька, яшчэ трэба пашукаць! — абурыўся гетман. — А пра пажар... то трэба ж было жаўнерам дзесьці рукі пагрэць!

Жарты жартамі, але Стэфан бачыў, што князь Януш ледзь стрымліваецца, каб не даць волю кулакам. Яго звычайна бледны твар з ледзь прыкметным россыпам рабаціння цяпер разгарэўся, а цёмна-сінія вочы пачарнелі, пасылаючы ў бок літоўскага канцлера такія маланкі, што і ў пана крайчага мароз па скуры пайшоў.

Жадаючы прадухіліць сварку, Юрый абышоў брата, хутка выступіў наперад і гучна закашляўся, і ўсе прысутныя разам павярнуліся да яго.

— А, гэта ты, пан Нямірыч, — князь гетман, здавалася, узрадаваўся з'яўленню госця. — Рады цябе бачыць. І цябе, пан крайчы, таксама, — кіўнуў ён Стэфану.

Аднак князь Альбрэхт быў не такі прыветлівы.

— Ты, пляменнік, разам з гэтымі ерэтыкамі вырашыў каталіцкую царкву разбурыць? — з'едліва пацікавіўся ён у Януша. — Таму і трансільванцаў на пасад радзіш? Ды хутчэй свет перавернецца, чым я дам на гэта сваю згоду!

— Ужо перавярнуўся, — Юрый адразу забыўся пра мірныя намеры. — Хіба даўно Рэч Паспалітая была прытулкам для замежных дысідэнтаў, якіх праследавала інквізіцыя? А цяпер і нам, яе сынам, на нашай радзіме месца няма! І калі б не фанатызм папістаў, хіба ўдалося б Хмяльніцкаму такі пажар запаліць?

— Годзе вам, паны, — прымірэнча сказаў пан Глябовіч, які быў каталіком і ў душы згаджаўся з канцлерам, але праз сваяцкія сувязі і залежнасць ад міласці князя Януша вымушаны быў прынамсі ўслых яго падтрымліваць. — Зараз ёсць і важнейшыя справы.

Але гэтым разам яго ціхі пратэст застаўся незаўважаным.

— Казацкае паўстанне — гэта кара гасподняя за тое, што ў Рэчы Паспалітай да гэтага часу жывуць ерэтыкі, якія адмаўляюць існаванне Святой Тройцы! — загрымеў князь Альбрэхт, а ягоныя клецкі і нясвіжскі кузэны згодна заківалі.

Юрый, да якога, вядома, быў звернуты гэты папрок, абразіўся, ды і князь Януш не прамаўчаў:

— Бачыш, пан Нямірыч? Пра якую мірную элекцыю можа ісці гаворка, калі нават Радзівілы паміж сабой паразумецца не могуць? — злосна кінуў ён і, ужо каторы раз за сённяшні вечар, паглядзеў на вялікі пазалочаны гадзіннік галандскай работы, які стаяў на разьбяным французскім «кабінеце». Гетман чакаў кузэна Багуслава — князя Біржаў, Дубінак, Слуцка і Капыля, які ўжо гадзіну таму павінен быў далучыцца да іх таварыства. Гэты Радзівіл таксама быў кальвініст, таму князь Януш вельмі спадзяваўся на яго падтрымку. Але час ішоў, а Багуслава ўсё не было...

— Дзе ж гэта князь Багуслаў? — першым не вытрымаў князь Аляксандр Людовік. — Як вядома, сямёра аднаго не чакаюць!

— Ужо даўно павінен быць тут, — прабурчаў князь гетман. — Ды, напэўна, увязаўся за якой-небудзь спадніцай.

— Ці на паядынку б'ецца, — з'едліва заўважыў князь Альбрэхт.

— Лепш бы на паядынку, таму што так хутчэй справіцца! — засмяяўся пан Глябовіч і раптам здзіўлена спытаў: — А што гэта там за шум?

З-за дзвярэй сапраўды даносіліся гукі нейкай калатнечы. Дарэшты раздражнёны Януш з такой сілай тузануў за ручку, што дзверы мала з завес не зляцелі, і стаў на парозе, здзіўлена разглядаючы служанак княгіні, якія, як звар'яцеўшы, бегалі па пярэднім пакоі, перасоўваючы мэблю і заглядаючы за парцьеры.

— Што адбываецца? — грозна спытаў ён. — Знайшлі час у хованкі гуляць!

— Ой, найсвятлейшы князь, — пажалілася адна з дзяўчын. — Князёўна кудысьці знікла, то вось, шукаем...

— А каб вам!.. — грымнуў Януш. — Дзесяць нянек адно дзіця не ўсцерагуць!

— Калі ж яна такая жвавая і хуткая, — усхліпнула дзяўчына. — Ой горачка, дзе ж яна?

Дзяўчына знікла, але праз хвіліну ўжо клікала слуг, каб шукалі князёўну.

— Ды дзе ж гэта Багуслаў? — злосна кінуў гетман, прычыніўшы дзверы.

— З мяне досыць! — адрэзаў князь Альбрэхт, падняўшы руку ў знак таго, што хоча гаварыць. — З нашага сарвігалавы ўсё роўна толку не будзе, таму і без яго абыдземся. Хоць як па мне, то і гаварыць няма пра што. Спачатку, як ты ведаеш, пляменнік, я Ка́раля Фердынанда на пасад раіў. Але цяпер кажу, што нашым каралём будзе каралевіч Ян Казімір. Я, уласна, і прыбыў сюды, каб абвясціць табе пра гэта...

— Гэта хто сказаў? — перарваў яго князь Януш.

— Я, — цвёрда сказаў канцлер. — І ўсе нашы сваякі са мной згодныя.

Усе Радзівілы, а таксама юны Міхал, сын князя Аляксандра Людовіка, згодна заківалі.

Па тым, што аблічча літоўскага гетмана стала пакрывацца чырвонымі плямамі, Стэфан зразумеў, што насоўваецца навальніца. І не памыліўся.

— Ты, дзядзька, вырашыў гэтага экс-кардынала і езуіта на трон пасадзіць?! — загрымеў гетман. — Ды мой бацька яшчэ ў часы мінулай элекцыі, калі каралевіч таксама кароны дамагаўся, сказаў, што хутчэй сам у каталіка ператворыцца, чым дапусціць да трона гэту нікчэмнасць! Нават маю сястру Катарыну адмовіўся за яго аддаць.

— На маё шчасце, — тут жа азваўся муж Катарыны, пан Глябовіч.

Усе зарагаталі, аднак князь Януш нават не ўсміхнуўся.

— Мала Багуслаў гэтым дурнем у Еўропе апекаваўся, — адкрыта абураўся ён, таму што варагаваў з прынцам яшчэ з юнацкіх гадоў. — З французскай няволі вызваліў, да мяжы правёў, каб Ян Казімір, не дай бог, зноў не трапіў у нейкую нягоду. Вось добрага караля ты, дзядзька, нам радзіш, што яго і курыца лапай заграбе! — смяяўся ён, не клапоцячыся пра тое, што сівыя вусы канцлера пагрозліва заварушыліся.

— Багуславу і самому нянька не перашкодзіла б, — не застаўся ў даўгу князь Альбрэхт. — Каралевіча французы вераломна ў турму кінулі, а князь як у Бастылію трапіў? Прыехаў сватаць нябожчыку каралю жонку і так стараўся, што на паядынак нейкага прынца выклікаў! Добра яшчэ, што хоць роўню, бо яму ж усё роўна, з кім біцца, — хоць з нейкім валацугам, хоць з уласным кузэнам. Што, Януш, хіба няпраўду кажу?

І літоўскі канцлер злосна ўсміхнуўся.

— Даўно гэта было, — буркнуў Януш і ўсё ж пачырванеў — ці то ад сораму, ці то ад гневу. — А ты, дзядзька, з тых часоў, калі вырашыў са мной за руку Катарыны Патоцкай* спаборнічаць, так і не паразумнеў.

Радзівілы счапіліся паміж сабой хутчэй, чым іх сваякі прыйшлі ў сябе і кінуліся іх разнімаць.

— О, здаецца, бойкай пахне! — пачуўся чыйсьці насмешлівы голас. — Значыць, я своечасова прыехаў.

Усе прысутныя разам павярнуліся да дзвярэй. На парозе стаяў раскошна апрануты *a-la mode française*** прыгожы малады чалавек з маленькай дзяўчынкай на руках. Яго зачасаныя на прамы прабор густыя цёмныя валасы мудрагелістымі завіткамі спадалі на плечы, моц якіх не мог схаваць французскі камзол з тонкага атласу. Прыгожая пастава загартаванага фізічнымі практыкаваннямі і ваеннымі баталіямі цела, прывабны твар з прамым носам і валявым падбародкам, поўныя вішнёвыя вусны з тонкай лініяй цёмных старанна падстрыжаных вусоў і дзіўнай прыгажосці і выразнасці вялікія карыя вочы — усё гэта рабіла яго сапраўдным красуном. На выгляд яму можна было даць гадоў дваццаць пяць, хоць на самай справе ён быў трохі старэйшы. З усмешкай, але пільна прыгажун аглядаў прысутных.

— Так, своечасова, — буркнуў Януш, адкідваючы прэч адарваныя з камзола літоўскага канцлера карункі.

* Катарына Патоцкая (?—1642) — першая жонка Януша Радзівіла, маці князёўны Ганны Марыі.

** Па французскім звычаі *(фр.)*.

— А вось і наш дарагі сваяк! — радасна ўсклікнуў пан Глябовіч. — Князь, а мы ўжо і не спадзяваліся...

— Гэта хто, князь Багуслаў? — шэптам пацікавіўся Юрый у Стэфана і, атрымаўшы пацвярджэнне, аж на дыбачкі падняўся, каб над галовамі прысутных лепш разгледзець знакамітага дуэлянта, пра подзвігі якога навыперадкі гулі еўрапейскія газеты.

Аднак шэпт аказаўся занадта гучны, і Багуслаў пачуў гэтыя словы.

— А што, не падобны? — з робленай заклапочанасцю спытаў ён і тут жа весела падміргнуў пану падкамораму.

Той, крыху сумеўшыся ад такой аказіі, прамармытаў нешта неразборліва, але Багуслаў ужо яго не слухаў. Князя з усіх бакоў абступілі Радзівілы, якім нячаста выпадала вітаць сваяка ў родных краях: «залаты мір», што добры дзясятак гадоў трымаўся ў Рэчы Паспалітай, быў не даспадобы яго бурлівай натуры. Увесь гэты час малады прыгажун знаходзіўся за мяжой, дзе паспеў праславіць сваё імя ўдзелам у бітвах з іспанцамі ў Нідэрландах пад сцягамі прынца Аранскага, паядынкамі з вядомымі арыстакратамі і любоўнымі перамогамі над першымі красунямі Еўропы. Атрымаўшы дрэнныя весткі аб паўстанні Хмяльніцкага, ён вярнуўся на радзіму, адхіліўшы панадлівыя прапановы французскага міністра — кардынала Мазарыні, які вельмі хацеў бачыць гэтага Радзівіла генералам французскай арміі.

— І што ж гэта за прыгажуня? — весела загаварыў князь Аляксандр Людовік, паказваючы на дзяўчынку на руках у Багуслава. — Ці не Ганнуся?

І аглянуўся на Януша.

— А то хто ж, — першы раз за вечар усміхнуўся той. — Няўжо не цуд? Князёўну слугі ўжо гадзіну шукаюць, а мой дарагі кузэн яшчэ не паспеў парог пераступіць — адразу знайшоў. Дзе ты была, малая нягодніца, га? — спытаў ён у дачкі.

— Я выглядала Багуслава, — паведаміла дзяўчынка і моцна абняла князя за шыю.

Усе зарагаталі, а князь ласкава прытуліў пляменніцу да сябе.

— Князя Багуслава, — раўнуў Януш. — Ён жа табе дзядзька!

Ганнуся нахмурылася.

— Пакінь, брат, — сказаў Багуслаў. — Будзем мы яшчэ паміж сабой тытуламі фарсіць. Mon ange*, ты на бацьку ўвагу не звяртай, гэта ён на мяне злуецца, — усміхнуўся ён пляменніцы. — Ці не так, Януш?

Гетман прамармытаў нешта неразборліва.

— Ну, добра, — усміхнуўся яго стрыечны брат. — Ганусенька, а хадзі павітайся з нашым любімым дзядзькам Альбрэхтам.

— Я ўжо збіраўся сыходзіць, — буркнуў абражаны канцлер, але Багуслаў, пасміхаючыся, перадаў яму дзіця.

Малая заўсміхалася змрочнаму князю так ветла, што ён, не маючы сваіх дзяцей, такі растаў і перастаў пазіраць на дзверы.

— Ну князь, ну хітры ліс, — прашаптаў на вуха Юрыю пан Мяржынскі, які, быўшы дыпламатам, не мог не ацаніць майстэрства, з якім Багуслаў уладзіў сварку.

А слуцкі князь паправіў дарагія карункі, што выглядалі з рукавоў камзола, і дзелавіта звярнуўся да старэйшага кузэна:

— Дык што, Януш, усе пагадзіліся падтрымаць каралевіча Яна Казіміра, або кагосьці пераконваць трэба?

Калі б цяпер пасярод залы з'явіўся анёл нябесны, то яго з'яўленне не ўразіла б прысутных так, як словы Багуслава. Радзівілы-каталікі радаваліся, пан Юрый аж збялеў, а на бледных шчоках літоўскага гетмана тут жа запалаў гнеўны румянец.

— Не дазволю! — крыкнуў ён. — Хоць бы і войска на Варшаву выведу ды разганю гэтую праклятую элекцыю, і...

— Не крычы, — раптам адгукнулася князёўна, і бацька застыў з адкрытым ротам.

— І сапраўды, Януш, — прымірэнча сказаў Багуслаў. — Спачатку выслухай, а потым крычы, калі ёсць ахвота.

— Гавары ўжо, — буркнуў той.

— Я толькі што з графам дэ Брэзі, французскім паслом, сустракаўся... Дык вось, Францыя гарой стаіць за Яна Казіміра. Дэ Брэзі ўжо перацягнуў на свой бок Швецыю, Брандэнбург і Курляндыю і абяцае Хмяльніцкага да міру схіліць — хоць уласнымі дзеяннямі, хоць з дапамогай султана. Ведаеш, брат, я яму веру, таму што

* Анёл мой *(фр.)*.

ў Францыі жартуюць, што іх пасол нагой прыадчыняе дзверы да турэцкага дывана... Ды і дэ Брэзі ў свой час добра паразумеўся з казацкім гетманам, вярбуючы казакоў у французскае войска.

— Дажыліся, — праскрыгатаў зубамі Януш. — Французы яшчэ будуць указваць, што нам рабіць ва ўласным доме! І на Хмяльніцкага паўплывае хіба пан бог або наша шабля, але ніяк не Мазарыні... Дарэчы, масье пасол не сказаў яшчэ, як каралевіч мае аддзячыць Францыі за падтрымку.

— Сказаў. Ян Казімір возьме ўдаву Уладзіслава сабе ў жонкі, — спакойна адказаў Багуслаў.

Запанавала нямая цішыня.

— Ты, пляменнік, нечуваную лухту вярзеш, — няўпэўнена прамармытаў князь канцлер. — Дзе ж гэта бачана, каб з удавой брата ажаніцца? І святое пісанне гэта забараняе, і царква, і бог...

— А гэта ўжо не наша справа, а папскага прастола, што за звонкую манету і блізкіх крэўных абвянчае, — пацінуў плячыма слуцкі князь. — У Яна Казіміра за душой адны даўгі, і элекцыя прорвы грошай патрабуе, якія ўдава брата яму абяцала даць... Ты не супся, Януш! — звярнуўся ён да брата, што, ухапіўшыся за галаву, абдумваў пачутае. — Тут трэба горшага баяцца, таму што палякі амаль аднагалосна Ка́раля на пасад раяць. Ярэма Вішнявецкі ў Варшаву з войскам прыбыў і сказаў, што ты яго прасіў элекцыю Дзьердзя Ракачы падтрымаць і ён на гэта пагадзіўся, бо той ваеннай славай і сваім мудрым праўленнем гэтага заслугоўваў. А што з сябе ўяўляе ягоны сын — таго князь не ведае і саджаць ката́ ў мяшку на трон не жадае, таму ўсімі сіламі Ка́раля Фердынанда падтрымлівае! Цяпер, кузэн, вазьмі і палічы галасы каронных і нас, літвінаў... Палічыў? І што цяпер скажаш?

Гаварыць не было чаго. Таму, з вялікай неахвотай, князь гетман пагадзіўся падтрымліваць каралевіча Яна Казіміра. Задаволены канцлер Альбрэхт і астатнія Радзівілы пакінулі палац.

Правёўшы гасцей, князь Януш вярнуўся ў гасцёўню яшчэ больш змрочны, чым да гэтага.

— Дрэнь нашы справы, Юрый, — уздыхнуў ён, заўважыўшы сумную ўсмешку пана падкаморага. — Большага дурня, чым Ян Казімір, яшчэ і свет не бачыў, а Ка́раль хоць і гаспадарлівы чала-

век, але яшчэ больш фанатычны каталік, чым яго брат. Калі, барані божа, стане каралём, то нам з табой і ва ўласным доме месца не будзе.

— Ды кінь, кузэн, — бесклапотна сказаў Багуслаў, якому насілу ўдалося вярнуцца да іх таварыства, бо маленькая Ганузя не жадала адпускаць ад сябе любімага дзядзьку. — Што табе той Ян Казімір? Будзеш яго на вяроўцы вадзіць, як пакорлівае цяля.

— Ахвотных і без мяне нямала знойдзецца, — буркнуў Януш. — І калі кожны яснавяльможны пан накладзе на тое цяля па вяроўцы, а затым пачне ў свой бок цягнуць, то добры будзе лад у Рэчы Паспалітай!

— А тут ладу не было і не будзе, — адазваўся Багуслаў. — Ці цяля здохне, ці пастухі перасварацца і пераб'юць адзін аднаго.

— Табе ўсё смяшкі!

— Ды божа ж мой, князь! Перастань хмурыцца, бо калі паміж Радзівілаў ладу не будзе, то дзе ж ён у Літве возьмецца?

— Ты маеш рацыю, кузэн, — прызнаў гетман, хоць хмурыцца не перастаў. — Дарэчы, рэкамендую табе майго добрага прыяцеля — пана Юрыя Нямірыча, кіеўскага падкаморага.

— Пан Юрый Нямірыч? — перапытаў Багуслаў, з цікавасцю разглядаючы пана падкаморага, бо ведаў пра яго цесныя стасункі з нябожчыкам князем Ракачы. — У Галандыі я пасябраваў з адным Нямірычам... вельмі весела разам час правялі! — Стэфан па гэтых словах шчасліва пачырванеў. — Але і пра цябе, пан падкаморы, я сёе-тое чуў... Ну так і ёсць — «Discursus de bello Moscovitico»*. Вядома, чытаў! Вывучаў права ў Сарбоне, ці не так?

— І яшчэ ў Оксфардзе, Кембрыджы, Лейдэне, Амстэрдаме, Базелі і Падуі, — усміхаючыся, дадаў Юрый.

— А мяне толькі на Гронінген, Франекер і Утрэхт хапіла, — легкадумна махнуў рукой князь. — Астатнія навукі я вывучаў на войнах з іспанцамі і ў жаночых абдымках. Але ўжо ў гэтых рэчах я любому магістру нос утру.

* «Discursus de bello Moscovitico» («Роздумы аб вайне з маскавітамі») — трактат, напісаны Юрыем Нямірычам у 1632 годзе.

Багуслаў, зразумела, жартаваў, таму што таксама меў добрую галаву на плячах, і Нямірычу гэта было вядома.

— Да тваіх паслуг, князь, — пакланіўся ён.

— Вельмі рады, пан Нямірыч. Хоць ты мне свае паслугі прапанаваў, а то ў Рэчы Паспалітай усе, наадварот, у маіх паслугах маюць патрэбу.

Стэфан, які ўвесь час моўчкі стаяў у цёмным куце, гэтым разам не вытрымаў і заліўся смехам. Багуслаў павярнуўся да яго.

— Гэта сапраўды ты, сябра? — весела ўсклікнуў ён, раскрываючы абдымкі. — C'est pas vrai!* Увесь час на цябе паглядаю і з цяжкасцю пазнаў, таму што нядаўна ты выглядаў як француз, а тут, у Варшаве, зусім у паляка ператварыўся!

— Маёй жонцы такая вопратка больш падабаецца, — растлумачыў Нямірыч, радасна абдымаючы князя.

— Жонцы?! Дык мы ж з табой развіталіся ў Бруселі ўсяго некалькі месяцаў таму! І ты за такі кароткі час ужо і ажаніцца паспеў?

Стэфан трохі сумеўся, убачыўшы на прыгожым твары Багуслава цень расчаравання. Яго выратаваў князь гетман.

— Што ты, пан падкаморы, думаеш пра Яна Казіміра? — звярнуўся ён да старэйшага Нямірыча.

— Нічога добрага, — уздыхнуў той. — Але паколькі з дзвюх бед варта выбіраць меншае ліха, то і я сам, і мае аднаверцы падтрымаем каралевіча... Але спадзяюся, — ён умольна паглядзеў на Януша, — што і твая княжацкая міласць не сыдзе са шляху свайго вялікага бацькі, які браў пад сваю апеку не толькі аднаверцаў, але і ўсіх дысідэнтаў Рэчы Паспалітай.

Нямірычава ўмова не стала для Радзівіла нечаканасцю.

— Не бойся, пан Юрый, — запэўніў гетман. — Палякі ўжо давялі да таго, што праваслаўныя за шаблі ўзяліся, і робяць усё, каб дысідэнты іх падтрымалі. Сваю прыхільнасць да цябе і да тваіх братоў па веры я ўжо паказаў і яшчэ дакажу на гэтым сойме. Калі хочаш, то і чацвёркай прысягну! — падміргнуў ён Нямірычу.

* Не можа быць! *(фр.)*.

— Такія прысягі занадта дорага абыходзяцца таму, хто іх дае, — з палёгкай усміхнуўся той і, перахапіўшы здзіўлены погляд Багуслава, растлумачыў: — Я, князь, так доўга дамагаўся пасады кіеўскага падкаморага, што калі атрымаў, то з радасці страціў і розум, і асцярожнасць. Калі Тышкевіч, кіеўскі ваявода, што ўсімі сіламі мне ў гэтай справе шкодзіў, пацікавіўся: «І як ты, такі-сякі сын, не верачы ў святую тройцу, ёю прысягаць будзеш?» — я здуру і ляпнуў, што дзеля такой пасады хоць чацвёркай прысягну! Тышкевіч тут жа запісаў мне ў віну абразу царквы і даставіў у суд — ледзь я вывернуўся!

— Бачу, здаровы сэнс пакінуў гэтую краіну, — саркастычна адзначыў слуцкі князь. — Не бойся, пан Нямірыч, калі князь гетман і забудзе сваё абяцанне, то я пра вас буду памятаць.

На гэтым размова і скончылася. Нямірычы, трохі абнадзееныя княжацкім словам, развіталіся, а Радзівілы засталіся сам-насам, бо мелі пра што пагаварыць...

На наступны дзень Януш сустрэўся з Янам Казімірам, каб абмеркаваць умовы яго выбару на польскі трон. Крыху пазней пан Юрый Нямірыч у складзе пасольства ад каралевіча адправіўся на перамовы з Хмяльніцкім, пасля заканчэння якіх казацкі гетман выдаў прашэнне аб тым, што і ён сам, і ўсё войска запарожскае просіць абраць каралём Яна Казіміра.

Князь Альбрэхт, выступаючы ад імя ўсёй Літвы, ашаламіў каронных паноў дэкларацыяй, што літвіны хочуць мець вялікім князем Яна Казіміра, а калі палякі не захочуць прызнаць яго каралём, дык няхай выбіраюць сабе караля асобна.

Эфект ад гэтых дзвюх рэляцый быў такі моцны, што пасля іх абвяшчэння каралевіч Ка́раль Фердынанд адмовіўся ад далейшай барацьбы за карону.

Так, дзякуючы французскім інтрыгам, літоўскай і казацкай падтрымцы, на трон Рэчы Паспалітай узышоў *Ioannes Casimirus rex**, якога невядомы весялун адразу перахрысціў на *Initium calamitatis Regni***.

* Ян Казімір, кароль *(лац.)*.

** Пачатак гібелі дзяржавы *(лац.)*.

Раздзел 3

# ВЯРТАННЕ Д’ЯБЛА

*Кракаў — Зембін*
*(студзень — люты 1649 года)*

Сямнаццатага студзеня ў Кракаве — старажытнай сталіцы польскіх каралёў — на трон узыходзіў новы кароль. Яму было трыццаць дзевяць гадоў, ён меў непрывабны і пабіты воспай твар з вялікім мясістым носам, неблагую фігуру, але кепскі нораў, распусныя звычкі, зусім не бліскучы розум і гарачае сэрца фанатычнага каталіка. Здолеў паказаць сябе хоць і адважным, але няздольным ваякам — як у Смаленскай вайне, так і на службе ў свайго дзядзькі, аўстрыйскага імператара, — такім самым нефартунным палітыкам, што ўмудрыўся замест партугальскай кароны надзець французскія кайданы, і ці не найгоршым кардыналам рымскай царквы, таму што, пасварыўшыся з Папам з-за адсутнасці прывілеяў, якія яму нібыта павінны былі належаць як прынцу крыві, шпурнуў пад ногі святому айцу свой кардынальскі капялюш... Таму ўрачысты звон вавельскіх* званоў адгукаўся ў сэрцах больш разумных яго падданых жалобным гулам, бо паслужны спіс гучных дзей новага караля не дазваляў спадзявацца на дабро ад яго кіравання.

* Вавель — старадаўняя рэзідэнцыя польскіх каралёў на аднайменным узгорку ў Кракаве.

Аднак Кракаў сустракаў свайго Пана весела. На вуліцах былі ўзведзены трыумфальныя аркі, апранутыя ў святочныя строі мяшчане яшчэ з ночы абляпілі вуліцы, вокны і нават дахі дамоў, каб добра разгледзець каралеўскі поезд. Гледачоў не расчаравалі ні святочна прыбраныя харугвы адборнага войска, якое выглядала так брава, быццам гэта не яно нядаўна з ганьбай збегла ад казакоў з-пад Піляўцоў, ні пышна апранутыя кавалеры, якія ехалі следам за каралеўскімі насілкамі пад вышытым золатам ківорыем* колеру той крыві, якая цяпер шчодра палівала зямлю іх мілай радзімы. Урачыста гулі трубы, гучалі барабаны, бомкалі званы, узбуджаючы ў сэрцах людзей надзею на новае, лепшае жыццё.

У вавельскім саборы, склаўшы на алтар прынесеныя хлеб і віно, Ян Казімір, паправіўшы на плячах цяжкую каралеўскую мантыю, паклаў руку на Евангелле і ўрачыста прамовіў словы прысягі: «Згодна з паспалітым правам буду правіць, абаронцам веры каталіцкай рымскай выступаць, кіруючыся справядлівасцю і шчырым выкананнем разнастайных вольнасцей». Затым ён быў памазаны святым ялеем, каранаваны каронай, якую яму на галаву надзеў прымас, і сеў на трон. Грымнулі, радасна зазвінелі званы, абвяшчаючы Польшчы і ўсяму свету аб тым, што «Ян Казімір, з Божай ласкі кароль Польскі, вялікі князь Літоўскі, Рускі, Прускі, Мазавецкі, Жамойцкі, Інфлянцкі, Смаленскі, Северскі і Чарнігаўскі, а таксама спадчынны кароль шведаў, готаў і венедаў на прастол узышоў».

Ні прысяга, ні гучныя тытулы не прадвяшчалі Рэчы Паспалітай нічога добрага. Хоць паміж Хмяльніцкім і палякамі было заключана перамір'е, яно нібыта і не датычылася Літвы, бо казацкі гетман усяляк адхрышчваўся ад таго, што атрады арудуюць у вялікім княстве па ягоным загадзе. Таму князь Януш, адмовіўшыся ад удзелу ў каранацыйных урачыстасцях, павінен быў ехаць у Літву, каб узброенай рукой дамагчыся міру і спакою. Багуслаў і Нямірычы на час святкавання прыбылі ў Кракаў, таму што мелі пільнаваць свае інтарэсы каля манарха. Радзівіл у свой час до-

* Ківорый, або балдахін, — покрыва з каштоўнай тканіны.

бра паслужыў Яну Казіміру, выцягваючы яго з французскай турмы, і яшчэ больш цяпер, падчас элекцыі, калі прыцягнуў на яго бок сваіх сваякоў і кліентаў, таму мог разлічваць на каралеўскую падзяку. Юрый Нямірыч яшчэ больш цесна зблізіўся з сенатарам Кісялём і далучыўся да ўмеранай шляхты, якая выступала за паразуменне з Хмяльніцкім, разлічваючы такім чынам вярнуць захопленыя казакамі маёнткі. Затое Стэфан, у душы спадзеючыся на мір, вырашыў падтрымаць вайну, якую літоўскі гетман вёў з паўстанцамі на Белай Русі. Для гэтай мэты ён вырашыў сустрэцца з князем Багуславам. Але, дабраўшыся да дома, які Радзівіл арандаваў на час святкавання непадалёк ад касцёла Святой Тройцы, Нямірыч наткнуўся на досыць вялікі натоўп кракаўскіх студэнтаў, якія, размахваючы распяццямі і абразамі Найсвяцейшай Дзевы, на розныя галасы раўлі: «Смерць ерэтыкам!» ды іншыя малапрыемныя для любога пратэстанта рэчы.

Стэфан аслупянеў ад нечаканасці. Пакуль ён азіраўся навокал, спрабуючы адгадаць, што адбываецца, нехта з палымяных абаронцаў каталіцкай веры пазнаў у ім аднаго з польскіх братоў.

— Гэта Нямірыч! З тых святататнікаў, што не прызнаюць ні раю, ні пекла, ні Папу Рымскага не шануюць, ні Дзеву Марыю, ні сына яе Ісуса! — закрычаў ён, і тут жа два дзясяткі рук пацягнуліся да разгубленага пана крайчага.

Перш чым Нямірыч змог хоць выхапіць для абароны шаблю, яго сцягнулі з каня, а натоўп, атрымаўшы новую ахвяру, пераможна зароў: «На вогнішча ерэтыка!» Слуг, якія спрабавалі дапамагчы свайму гаспадару, спасцігла тая ж доля...

Хтосьці са студэнтаў прапанаваў падпаліць дом, каб засмажыць на гэтым вогнішчы і Нямірыча, і Радзівіла, і іх слуг-ерэтыкоў заадно. Натоўп радасна падтрымаў гэтую прапанову. У вокны ўжо паляцелі са злавесным свістам камяні, і тут дзверы княжацкага дома адчыніліся, і адтуль высыпала ўзброеная да зубоў чэлядзь. Сярод слуг Стэфан радасна ўбачыў сваіх сяброў з найбліжэйшага княжацкага акружэння: Хувербэка, Ферха, Фелкерзона, Кажкіля і Невяроўскага, усіх пры шпагах і з пістолямі напагатове. Яны рынуліся ратаваць таварыша, але спыніліся, таму што на парозе з'явіўся сам князь Багуслаў.

— Ого! — сказаў весела. — І чым гэта я, панове, заслужыў такую ўвагу?

Студэнты не чакалі ўбачыць князя, трохі сумеліся, але нейкі напаўп'яны клірык усё ж крыкнуў з-за іх спін:

— Ты, князь, у Літве сваю ерэтычную службу праўляй, а ў Кракаве не смей! І свайго пастара нам дабром выдай, бо сілай возьмем!

— Возьмем! — радасна загулі студэнты. — Смерць ерэтыкам!

Багуслаў яшчэ раз паспрабаваў уціхамірыць зборышча, але папісты не слухаліся і рухаліся далей, таму ён схапіў загрудкі верхавода і сунуў яму пад нос нейкую паперу:

— Чытаць умееш?!

Гэта быў каралеўскі дазвол князю на адпраўленне кальвінісцкай службы ў Кракаве, які трохі астудзіў запал абаронцаў папскага прастола. Клірык паспрабаваў пратэставаць, але хутка пляваўся ўжо не праклёнамі, а крывёю: Радзівіл засадзіў кулаком яму ў твар. Сам жа павярнуўся да слуг і спакойна скамандаваў:

— Zielen!*

Студэнты, убачыўшы нацэленыя на іх ствалы пістоляў, адступілі. Заўважыўшы, што Радзівіл падняў руку, быццам збіраючыся аддаць загад страляць, яны дружна кінуліся наўцёкі пад з'едлівы смех чэлядзі.

Багуслаў загадаў слугам апусціць зброю.

— Стэфан, ты?! — весела крыкнуў Нямірычу, якога ўцекачы пакінулі на полі бою. — Я вырашыў, што ты з'ехаў з Кракава, не развітаўшыся са мной. Такой знявагі я б табе не дараваў!

— Я і сам бы сабе гэтага не дараваў, — выдыхнуў Нямірыч, паціскаючы рукі сябрам, якія гучна абураліся нахабствам католікоў. — Святы божа, што гэта тут было?

Князь махнуў усім вяртацца ў дом, таму што суседскія вокны ўжо абляпілі разявакі.

— Кракаўскія студэнты буянілі, — сказаў, пакінуўшы жарты. — Добра, што я здагадаўся ўзяць у караля дазвол на набажэнства. Сам ведаеш, у сварцы пратэстанта з каталікам віну заўсёды пакладуць на пратэстанта.

* Цэлься! *(ням.)*

— Калі табе, Радзівілу, трэба пытацца каралеўскага дазволу, каб маліцца богу ў сябе дома, то што ўжо казаць пра нас, арыян, — уздыхнуў Нямірыч, праходзячы ў сенцы ўслед за гаспадаром, а далей па лесвіцы — і ў святліцу. — Я чуў каралеўскую прысягу, якой Ян Казімір абяцаў усяляк каталіцкую веру абараняць... Што ж цяпер будзе?

Багуслаў ляснуў дзвярыма перад носам свайго расчараванага таварыства, якое ўжо натапырыла вушы.

— Маем езуіта на троне, таму нічога добрага. Вось мне Ян Казімір залатыя горы абяцаў, каб я яго элекцыю падтрымаў, а прыслаў толькі патэнт палкоўніка каралеўскай гвардыі... ды яшчэ і праз пасланца яго перадаў. Я, вядома, гэтую грамату адразу назад адаслаў разам з запіскай, што кардынал Мазарыні мне чарговы раз генеральскі патэнт прапануе, і я яго такі прыму, бо атрымліваецца, што кардынал рымскай царквы шчадрэйшы да пратэстантаў, чым польскі кароль!.. Добра, не будзем пра сумнае. Ты да мяне з нейкай справай прыбыў?

Князь гасцінна прысунуў госцю крэсла бліжэй да кафлянай печы, якая дыхала цяплом, але Стэфан, які больш спалохаўся, чым змёрз, яшчэ доўга працягваў дрыжаць.

— Я, князь, сорамна і сказаць, хоць і дажыў да дваццаці шасці гадоў, а пораху так і не панюхаў, — прызнаўся, калі крыху прыйшоў у сябе. — То сабраў за свой кошт сотню ахвотнікаў, каб і Айчыне паслужыць, і павhouseholds пад рукой такога слаўнага рыцара, як твая міласць. З тым да цябе і прыехаў.

— Дзякуй табе, mon cher ami*, на добрым слове, — усміхнуўся Радзівіл. — Я да Януша пакуль ніяк далучыцца не змагу, бо мне трэба пільнаваць радавыя інтарэсы пры каралі. Але ўпэўнены, што брат табе вельмі ўзрадуецца. І годнага таварыша я табе знайду: у Літве пан Саковіч — ашмянскі падкаморы і мой верны слуга — войска гуртуе. Слаўны ён ваяр, гэта я шчыра табе кажу, і ў гэтай вайне ўжо адзначыцца паспеў, таму што, пакуль я рыхтаваўся граміць Фронду** ў Францыі, Адам з маім

* Дарагі сябар *(фр.)*.

** Шэраг антыўрадавых паўстанняў у Францыі ў 1648—1652 гадах.

галоўным аканомам Сасноўскім адстаялі мае ўладанні падчас казацкай навалы. Так турнулі казацкага палкоўніка Сакалоўскага з-пад Слуцка, што той ледзь жывы сышоў і амаль усіх людзей на полі бою пакінуў! Таму, калі хочаш, ідзі са сваімі людзьмі пад яго руку. А калі не, то зрабі мне ласку. Са мной таксама ёсць пяць сотень выбраннікаў* і гарматы, якія прыслаў брандэнбургскі курфюрст, — суправадзі іх да князя гетмана. Заадно і пану Саковічу мой загад завязеш, хай хутчэй да Януша спяшаецца.

— Добра, — адразу ж пагадзіўся Нямірыч, радуючыся магчымасці асабіста пазнаёміцца з чалавекам, пра якога радзівілаўская моладзь ахвотна балакала.

Балачкі тыя не былі добрыя, але Стэфан тлумачыў іх звычайнай зайздрасцю да фартуны чалавека, якога сам Багуслаў лічыў блізкім сябрам. Адзначыўся пан Саковіч і на мінулым сойме, дзе, вядома ж, падтрымліваў Яна Казіміра і як выбарны суддзя соймавай калегіі «для разбірання разнастайных крыўдаў і эксцэсаў падчас элекцыі» стрымліваў ды прыводзіў да пакорнасці незадаволеных — перш за ўсё прыхільнікаў Ка́раля Фердынанда. Работы пану суддзю хапала, з-за чаго Стэфану так і не давялося з ім убачыцца. Таму ён шчыра ўзрадаваўся будучаму знаёмству, пацвердзіўшы свой намер вядомай сентэнцыяй: «На вайне добры таварыш не перашкодзіць».

Багуслаў сеў пісаць ліст ашмянскаму падкамораму. Хутка завяршыў гэтую справу і, прысыпаўшы пасланне пяском, чакаў, пакуль высахне чарніла.

— Як там пажывае твой «Д’ябал», Нямірыч? — спытаў ён, каб не маўчаць. — Мне ўжо распавялі пра тваю прыгоду.

— Я якраз сам пра яго ўспамінаў, — прызнаўся Стэфан. — Сёння бачыўся з Янам Сабескім, ад яго і даведаўся, што дзядзілаўскі стараста кудысьці знік... То я падумаў, няўжо той шляхціц зноў бясчынствуе?

* Тут: прафесійныя вайскоўцы, якія жылі ва ўладаннях князя, атрымлівалі ад яго плату і зямельны надзел, былі вызваленыя ад падаткаў, усіх работ і павіннасцей узамен на выкананне павіннасці вайсковай. Іх дзеці мужчынскага полу па дасягненні паўналецця таксама мелі стаць да князя на ваенную службу.

— Цікава, — нахмурыўся Багуслаў. — Мне казалі, што ў пана «Д'ябла» конь нібыта быў з радзівілаўскай стайні?

— Пра каня не ведаю, а даспехі сапраўды з гербам Радзівілаў, — пацвердзіў Нямірыч.

— Гэта вельмі дзіўна, — задумаўся князь. — Але калі твой жартаўнік такімі справамі займаецца, то і каня мог разбоем дастаць... А які ж з сябе той «Д'ябал»?

— У цемры, князь, не надта разгледзіш, але прыгажун, чорт! Сярэдняга росту, чарнявы. І такі калючы погляд мае, нібы вочы на самай справе ў д'ябла пазычыў.

— Малады ці стары?

— Ні тое, ні іншае. Але не варта б яму так забаўляцца, бо чацвёрты дзясятак гадоў яўна ўжо даўно размяняў.

Стэфану здалося, што Багуслаў дзіўна напружыўся, пачуўшы гэта.

— І калі гэта ты яго сустрэў?

— У кастрычніку, трэцяга дня...

Радзівіл з палёгкай уздыхнуў.

— Тады ён павінен быць у Літве, — ледзь чутна прамармытаў ён. — Але на ўсялякі выпадак...

Ён узяў пяро і дапісаў у лісце яшчэ некалькі радкоў. Затым запячатаў пасланне сваёй пячаткай і працягнуў яго Нямірычу.

— З богам, сябра, — усміхнуўся ён. — Хай табе ніякая нячыстая сіла на шляху не сустракаецца.

* * *

Развітаўшыся з Радзівілам, Стэфан адразу адправіўся да брата Юрыя, каб паведаміць пра ад'езд і заадно распавесці аб сваёй прыгодзе. Юрый быў не адзін. Паміж гасцей, якія заклапочана абмяркоўвалі элекцыю, Стэфан з радасным здзіўленнем пазнаў Габрыэля Любянецкага — асабістага сакратара Багуслава Радзівіла. Той пра нешта шаптаўся з паслом князя Ракачы. Габрыэль быў стрыечны брат яшчэ аднаго з Любянецкіх — Мікалая, жанатага з сястрой Нямірыча, Геленай, таму Стэфан цёпла з ім павітаўся і пайшоў да брата, каб не перашкаджаць размове.

— Мяне князь канюшы* ў Літву пасылае, да пана Саковіча. Павінны разам да князя гетмана далучыцца, — сказаў ён Юрыю.

— Да пана Саковіча? — здзівіўся і адначасова нахмурыўся старэйшы Нямірыч. — Чаму цябе?!

Стэфан трохі разгубіўся.

— Чаму ж не? — спытаў ён. — Багуслаў хацеў да яго Яна Невяроўскага** адправіць, але перадумаў. Жартаваў, што тады шмат каго са слуг не далічыцца, бо гэтыя паны адзін аднаго не церпяць... А ты знаёмы з ашмянскім падкаморым?

Юрый згодна кіўнуў.

— Ведаю яго яшчэ з тых часоў, як ён на сойме па загадзе Радзівілаў спрабаваў выратаваць ад закрыцця нашу школу ў Рахаве, ды так, што наклікаў абвінавачванні ў ерасі на сябе самога! Слаўны ён рыцар і магутны кліент радзівілаўскага дому. І заўваж, такі кліент, якому Радзівілы давяралі ўлагоджванне гучных палітычных спраў, куды не жадалі ўмешвацца адкрыта. Пра Рахаў я табе ўжо казаў, а яшчэ быў і сойм 1646 года, дзе пан Адам так горача пратэставаў супраць каралеўскіх намераў вайны з асманамі, што крыху не выклікаў новы рокаш***. Супакоіўся толькі тады, калі князь Януш гетманскую булаву атрымаў, а самога Саковіча кароль па намове Радзівіла прызначыў у камісію па тлумачэнні «вечнага міру» са Швецыяй... Вялікага розуму і адвагі гэты чалавек. Толькі ты з ім асцярожней будзь, таму што нядобрая пагалоска пра пана Адама па Літве ідзе.

— От, — легкадумна махнуў рукой Стэфан. — Людзям абы языкамі мянціць.

Відаць было, што Юрый не падзяляе такой думкі, але яшчэ раз заклікаць брата да асцярожнасці ён не паспеў, таму што дзесьці побач невыносна завішчала скрыпка, так, нібы хтосьці вострым цвіком вадзіў па шкле. Зморшчыўшыся, пан падкаморы

* Прыдворная пасада, якую займаў Багуслаў Радзівіл ад 1647 года.

** Даверансы слуга Багуслава Радзівіла, адзін з герояў кнігі Ірыны Данеўскай «Багуслаў Радзівіл: Нямецкі прынц з Вялікага Княства Літоўскага».

*** Афіцыйнае паўстанне супраць караля, на якое мела права шляхта для абароны сваіх правоў і вольнасцей.

закрыў рукамі вушы і выглянуў у акно, каб разгледзець, хто гэта так гвалтуе інструмент. І ўбачыў: перад суседнім домам, вокны якога былі чамусьці прыадчыненыя, на перавернутай бочцы сядзела абадранае цыганё і, нягледзячы на сцюжу, добрасумленна вадзіла смыкам па струнах.

— Гэй ты! — раўнуў Нямірыч. — Ану перастань, бо я табе зараз на рэбрах кракавяк сыграю! Ох і затанцуеш ты ў мяне, вырадак пекла!

— Не магу, яснавяльможны пане, — спалохана піскнуў горамузыка. — Да майго гаспадара якраз яўрэі прыйшлі, доўг патрабуюць аддаць, то ён мне загадаў іграць, хоць бы і неба на зямлю падала. А мой пан такі сярдзіты, што і на той свет адправіць, вокам не міргне...

І няшчаснае цыганё так жаласна скрывілася, што іншым разам такі кранула б Нямірыча. Але іграць не пераставала. Скрыпка выла і пішчала, аж душа пераварочвалася.

На шчасце, у яўрэяў аказаўся тонкі слых, і яны, так і не дабіўшыся грошай, пакінулі суседскую сядзібу. Пасля ўцёкаў крэдытораў музыка адразу перастаў іграць, і госці Нямірыча з палёгкай уздыхнулі. Пасля таго як семіградскі пасол, развітаўшыся з гаспадаром дома, пайшоў, усе разам атачылі Любянецкага.

— Габрыэль, — звярнуўся да яго Збігнеў Морштын*. — А ну раскажы нам шчыра, што за чалавек гэты князь канюшы? Чутак пра яго ходзіць — не злічыць, але ўсё ж хочацца ведаць праўду. Каго ж і пытацца, як не цябе — яго сябра і паверанага.

— Нічога я распавядаць не буду, — наадрэз адмовіўся Любянецкі. — Адно табе, пане браце, скажу, што князь Багуслаў — разумны чалавек. З ім можна мець справу.

— Жанчын, кажуць, любіць? — весела ўдакладніў пан Пржыпкоўскі**.

— Любіць, — неахвотна пацвердзіў Габрыэль. — А яны яго яшчэ больш.

* Збігнеў Морштын (каля 1628 — 1683) — выбітны польскі паэт.

** Самуэль Пржыпкоўскі (?—1670) — тэолаг, мемуарыст, біёграф князёў Януша і Багуслава Радзівілаў.

Усе засмяяліся.

— А ў Бастыліі таксама праз дзяўчыну апынуўся? — працягваў дапытвацца Пржыпкоўскі.

Пан Любянецкі і на гэта аджартаваўся, але было відаць, што нават яго жалезнай вытрымцы хутка настане канец, і Стэфан вырашыў перапыніць гэты допыт.

— Багуслаў, Багуслаў! — выгукнуў ён, і шляхціцы сталі спалохана аглядацца, шукаючы поглядам Радзівіла.

Пераканаўшыся, што трывога фальшывая, яны асуджальна загудзелі, а потым дружна зарагаталі з уласнага страху.

— А што, паны, ужо і штаны намачылі? — засмяяўся таксама Юрый. — Богам прашу, давайце пагаворым пра больш важныя рэчы... Габрыэль, што ад цябе хацеў пан пасол? — звярнуўся ён да Любянецкага. — Калі гэта, вядома, не таямніца...

— Якая там таямніца, — паціснуў плячыма той. — Ракачы прагне дружбы князя канюшага і, ведаючы, што я сябрую з князем, хацеў даведацца, ці можа ён сам або яго брат спадзявацца на карону зараз, калі каралём крыкнулі Яна Казіміра. Я яму адкрыта сказаў, што зможа правіць хіба пасля смерці Вазы, калі, вядома, таго раней не скінуць з прастола.

— А на гэта надзеі няма, — дадаў пан Пржыпкоўскі.

— Англічане не толькі ваявалі супраць свайго караля, але і галаву яму публічна адсеклі*, — задуменна сказаў Юрый.

Гучнае ныццё скрыпкі, якое зноў данеслася да пакоя нават праз зачыненыя вокны, перапыніла гэтую размову: да суседа Нямірыча прыйшла яшчэ адна працэсія і затрымалася ў яго надоўга. Відаць, небарака моцна завінаваціўся крэдыторам, бо іх не спыняла ні музыка, ні благанні даўжніка.

Нямірычу ўжо і вушы залажыла, а госці або сядзелі ўхапіўшыся за галовы, або сумна глядзелі на дзверы. Усім было не да палітыкі.

— З мяне досыць! — не вытрымаў Юрый і, стукнуўшы крэслам, падняўся з такім рашучым выразам твару, які не прадвяшчаў суседу нічога добрага.

* Гаворка ідзе пра Карла I (1600—1649), англійскага караля з дынастыі Сцюартаў.

А той, нават не здагадваючыся, якія хмары сабраліся над яго галавой, якраз выйшаў выправадзіць з дому шумнае жыдоўскае племя. І Юрый, падышоўшы да акна, падскочыў ад нечаканасці: суседам аказаўся сам былы каронны стражнік Самойла Лашч!

Гэтага пана ведала і баялася ледзь не ўся Рэч Паспалітая, бо злою славай з ім мог зраўняцца хіба нябожчык пан Станіслаў «Д'ябал» Стадніцкі, за якога сябе выдаваў невядомы дзядзілаўскі жартаўнік. Гэта Лашч на Вялікдзень разам са сваім кодлам разбойніцкіх «выхадцаў з пекла» выразаў усіх жыхароў мястэчка Лысянка, не пашкадаваўшы ні мужчын, ні жанчын, ні дзяцей, ні святароў. Гэта ён, перакрыўшы ўсе шляхі на Кіеў нібыта для таго, каб абараніць край ад татараў, рабаваў і забіваў нявінных купцоў і падарожнікаў, якіх нячысты прыводзіў яму ў рукі. Гэта ён выкрадаў дзяўчат у бацькоў, каб аддаць іх на пацеху сваім разбойнікам. Гэта ён, залажыўшы свае маёнткі крэдыторам, потым вяртаў іх сілай. Гэта ён рабаваў, паліў, забіваў сваіх суседзяў, так што нават сам князь Ярэма Вішнявецкі аднойчы быў вымушаны абараняцца ад яго шайкі ўсім сваім войскам. І, нарэшце, гэта менавіта ён, зарабіўшы за сваё бурнае жыццё больш дзвюхсот баніцый і каля чатырох дзясяткаў інфамій, загадаў пашыць з іх падкладку для кажуха, у якім горда прыбыў на каралеўскі двор...

Юрый ухапіўся за пістоль, які, як на тое, апынуўся пад рукой.

— А, пан Лашч, ці ж пазнаеш мяне? — крыкнуў люта, бо ў свой час моцна нацярпеўся ад самавольства былога стражніка і яго высокага заступніка — нябожчыка пана гетмана Канецпольскага.

— А, гэта ты, пан ерэтык? — драпежна прыжмурыўся той. — Дык цябе яшчэ не засмажылі на вогнішчы айцы-езуіты?

— Як бачыш, — азваўся Юрый, наводзячы на яго пістоль. — А нагадай жа мне, мярзотнік, колькі разоў я магу беспакарана забіць цябе, атрымаўшы наўзамен вялікую падзяку ўсёй Рэчы Паспалітай?! Маўчыш? Ну добра, дзве сотні смярцей я табе дарую, але сваю адну ты ўсё ж атрымаеш, таму што ўжо не варты таго, каб прыстойны шляхціц выйшаў з табой на паядынак.

Лашч насмешліва засмяяўся:

— Не спяшайся, Нямірыч. Тыя судовыя прысуды я атрымаў яшчэ пры старым каралю, а наш новы валадар, Ян Казімір, мне

ўсе грахі даравау. Так што цяпер я вольны і, галоўнае, сумленны і чысты перад законам чалавек!

Заўважыўшы, як ад гэтай весткі разгублена выцягнуўся твар Нямірыча і як яго госці ўслых абурыліся тым, што новы кароль пачынае сваё праўленне з такога беззаконня, былы каронны стражнік гучна зарагатаў. Смяяўся, сагнуўшыся ў тры пагібелі, трымаючыся за жывот, пакуль смех не перайшоў у надрыўны хрып. Лашч выцягнуў наперад руку, як бы жадаючы схапіць душу, што ўжо развітвалася з яго грэшным целам, і ўпаў, скаланаючыся ў канвульсіях. А потым заціх.

Цыганё спалохана завішчала і кінулася прэч, не забыўшыся прыхапіць з сабой скрыпку...

Запанавала нямая цішыня. Госці і гаспадары дома здзіўлена пазіралі адзін на аднаго: цяжка паверыць у тое, што грозны Лашч аддаў богу душу, не вытрымаўшы ўласнага смеху. Цела адразу абступілі выпадковыя мінакі. Хтосьці нахіліўся і, прыклаўшы вуха да яго грудзей, паслухаў, ці б'ецца сэрца. А потым развёў рукамі, падаючы знак, што ўжо нічога нельга зрабіць.

Пан Юрый павольна перахрысціўся.

— Не веру я ў існаванне пекла, — гучна сказаў ён. — Але калі яно ўсё ж існуе, дык няхай там чэрці моцна аплацяць нябожчыку тое, за што ён не атрымаў належнай адплаты пры жыцці...

Стэфан пацягнуўся па шапку.

— Я пайду, — сказаў ён. — Бо хутка сюды збяжыцца палова Кракава, так што і з дома спакойна не выйдзеш. А я ўжо заўтра хачу рушыць у дарогу.

Абняўшы на развітанне ўсіх прысутных, ён сышоў, пакінуўшы сяброў абмяркоўваць падзею, якая толькі што адбылася на іх вачах.

Нечакана Юрый нешта ўспомніў. Падбегшы да акна, ён крыкнуў услед брату:

— Будзь асцярожны! Пан Саковіч небяспечней Лашча будзе, бо розум мае і там, дзе нябожчык гучна разбой рабіў, дзейнічаў спадцішка, так што і ў суд яго пазываць — марная справа.

Стэфан гэтага не пачуў. На вуліцы ўжо сабраўся шумны натоўп, каб зблізку паглядзець на мерцвяка, ад якога пры жыцці

лепш было трымацца далей, таму давялося добра працаваць локцямі, каб выбрацца цэлым.

А пан Лашч яшчэ доўга ляжаў на каменнай маставой Кракава, гледзячы невідушчымі вачыма ў неба, і здзіўлена ўсміхаўся, нібы дзівячыся таму, што так нечакана прыйшла да яго смерць.

* * *

...Літва была ахоплена полымем паўстання, але Нямірычу ўдалося шчасліва дабрацца ў Зембін — галоўную рэзідэнцыю ашмянскага падкаморага і віленскага канюшага* пана Адама Мацея Саковіча. Жаўнераў князя Багуслава пад камандай пана Маскевіча і сваіх людзей Стэфан яшчэ раней адправіў роўным шляхам у Тураў, дзе знаходзіўся князь гетман, таму што не адважыўся абцяжарыць падкаморага такой колькасцю галодных ратоў. А сам з паважаным радзівілаўскім кліентам Рыгорам Мірскім і невялікім початам павярнуў да Зембіна, каб асабіста пазнаёміцца з чалавекам, рыцарская слава якога грымела па ўсёй Літве.

Мястэчка аказалася невялікае, але ахайнае. Высыпаная рачным жвірам роўная галоўная дарога тут, на зямлі балот і лясоў, сведчыла пра заможнасць і гаспадарлівасць уладальніка. Дамы былі драўляныя, каменных не было зусім. Драўляны быў і кляштар, які належаў дамініканскаму ордэну. Манахі з цікаўнасцю глядзелі на прыезджых, аднак, заўважыўшы, што тыя і не падумалі перахрысціцца на святы манастыр, яшчэ доўга крывіліся і нешта асуджальна мармыталі ім услед.

— Што за цуд? — здзівіўся Нямірыч. — Я думаў, што давераны слуга князя Багуслава павінен быць адной з ім веры, а трапіў у каталіцкае гняздо.

Пан Мірскі толькі ўсміхнуўся.

— Пан Саковіч сапраўды каталік, але біржайскім Радзівілам усё роўна, хто са слуг у якую царкву ходзіць, абы розум мелі і ім верна служылі. Але што да манастыра, то гэта не пана Саковіча

* Гэты ганаровы тытул пан Саковіч атрымаў 18 мая 1645 года дзякуючы радзівілаўскай пратэкцыі.

справа, а ягонай жонкі, пані Марыяны Тышкевічаўны, дачкі нябожчыка менскага ваяводы.

— Дык пан падкаморы і Тышкевічам радня? Важная птушка, няма чаго сказаць.

— Ён з Корвінаў, род якіх ад вугорскіх каралёў ідзе... Ці ад рымскіх патрыцыяў, калі верыць пану Гасеўскаму. Яны з панам падкаморым аднаго герба. Толькі продкі пана Вінцэнта аказаліся спрытнейшыя за Саковічаў, бо і грашанят сабралі больш, і добрую славу заслужылі. А наконт жаніцьбы... ды ты, пане, напэўна чуў гэтую гісторыю?

— Хіба краем вуха, — прызнаўся Стэфан. — У тыя часы я, мабыць, быў яшчэ дзіцём.

— Доўга Літва пра гэта гудзела, — пагрузіўся ва ўспаміны шляхціц. — Гаварыла б і па сёння, але пан Саковіч хутка мясцовай шляхце раты пазатыкаў, а з панам Саковічам жарты дрэнныя. Я табе таксама нічога распавядаць не буду, і ты трымай язык за зубамі, бо надта ж той чорт не любіць пра гэта ўзгадваць.

— А ты, пане, мабыць, праз веру ашмянскага падкаморага не любіш? — не ўтрымаўся Нямірыч, заўважыўшы, як дзіўна скрывіўся твар Мірскага пры згадцы пра вернага слугу князя Багуслава.

— Ды мне ўсё роўна — пратэстант, ці праваслаўны, ці і каталік, абы быў добры чалавек, — адказаў праваднік. — Але пан Адам зусім бога ў сэрцы не мае! Вось пазнаёмішся з ім сам, сам зразумееш...

Нямірыч яму не паверыў. Тое, што пан Саковіч калісьці абараняў яго аднаверцаў на сойме і быў блізкім сябрам князя Багуслава, значыла ў яго вачах больш за любыя засцярогі.

— Ну ўсё, дзякуй богу, прыехалі! — пачуў ён голас Мірскага і, падняўшы галаву, зразумеў, што яны спыніліся пасярод шырокага двара багатай шляхецкай сядзібы.

Гэта быў прасторны рублены дом, да якога прылягаў доўгі шэраг гаспадарчых пабудоў, дзе кіпела праца. Бліжэй да дома стаяў склеп з прыскляпеннем — прыступкамі пад невялікім дахам, з другога боку — вялікая лазня з сенцамі і гасцявой святліцай, пякарня, рубленыя з дубовага лесу і крытыя гонтам спіжар-

ні*, бровар, саладоўня і вазоўня, з-за напаўрасчыненых варот якой выглядалі сані і панскі рыдван. На гербе, які ўпрыгожваў дзверцы, драпежнага выгляду крумкач трымаў у дзюбе залаты заручальны пярсцёнак: па сямейнай легендзе, продак пана Саковіча ажаніўся не менш выгадна, чым яго нашчадак. Такі самы маляваны герб красаваўся і на драўлянай браме, праз якую заехаў Нямірыч, і нават на канавязі. Стэфан з цікавасцю азіраўся навакол і ўхвальна ківаў на тое, што бачыў, бо паўсюль адчувалася рука добрага і багатага гаспадара, а смачны хлебны дух з пякарні вельмі парадаваў згаладалых падарожнікаў, навяваючы прыемныя думкі пра мір і ўласную ўтульную сядзібу. Але і ў мястэчку, і вакол сядзібы хапала ратнай браціі, якая вось-вось павінна была выступіць у паход. Вайна была не за гарамі!

Насустрач прыезджым высыпала чэлядзь. Стэфан, даручыўшы клопатам слуг сваіх людзей, хутка ўзбег на высокія крытыя гонтам сенцы, пацягнуў за меднае кольца ў пашчы лютага льва на абабітых жалезам дубовых дзвярах і апынуўся ў пpасторных цёмных сенях. Гэтае памяшканне было прахадным, і дворня з чорнага ўваходу заўзята сноўдала туды-сюды — то падкінуць дроў у хатнія печы, то завіхаючыся каля іншых гаспадарчых спраў. За домам, як паспеў разглядзець Нямірыч, стаялі рубленыя і крытыя саломай стайня і птушнік, дзе квахталі куры і гагаталі гусі. Каля прыцярушаных снегам гародаў відаць былі аплеценыя галлём хлявы з быдлам і пуня.

Правыя, з мудрагелістай разьбой, дзверы вялі з сяней у панскія пакоі, а левыя, прасцейшыя, — у шумную людскую, дзе кіпела праца. Паведаміўшы пакаёваму мэту прыезду, шляхціц пайшоў за ім і трапіў ва ўбраную з усходняй пышнасцю святліцу. Было бачна, што пану падкамораму ўдалося такі нажыць трохі майна. Нават звыклы да раскошнага жыцця Нямірыч захоплена прысвіснуў, заўважыўшы каштоўныя турэцкія дываны на падлозе, тыгравыя шкуры і немалую колькасць дарагой зброі на сценах, дзе асабліва прыцягвалі погляд упрыгожаныя каштоўнымі камянямі турэцкія і татарскія шаблі з залатымі і срэбнымі рукаяткамі, нажы і кінжалы

* Каморы.

тонкай працы, цісавыя лукі са стрэламі ў пазалочаных скураных калчанах... З упрыгожаных разьбянымі малюнкамі драўляных бэлек на доўгіх пасярэбраных ланцугах звісалі алейныя свяцільні з увагнутымі і начышчанымі да люстранога бляску масянжовымі* аполкамі, што адбівалі святло. Вялікія спіжавыя** падсвечнікі стаялі і на падлозе. У немалой шафе было поўна шклянога, цынавага і срэбнага посуду, а абабітыя пазалочаным курдыбанам*** дубовыя крэслы маглі б упрыгожыць і каралеўскі палац. Лавы ўздоўж сцен былі пакрытыя парчовымі пакрываламі-налаўнікамі са срэбнымі кутасамі, а ад вышытага золатам і жэмчугам турэцкага абруса на вялікім стале патыхала ўжо і марнатраўствам.

Шум звонку прымусіў Стэфана падысці да акна. Праз тоўстыя абалоны**** ў цынавых рамах цяжка было нешта разгледзець, таму Нямірыч адчыніў акно і адразу адхіснуўся, сустрэўшыся са страшным позіркам мёртвых вачэй на скрыўленым твары павешанага. Прыгледзеўшыся, Нямірыч заўважыў яшчэ некалькіх мерцвякоў, што віселі непадалёк і выглядалі гэтак жа злавесна.

— Чаго скачаш, пан Нямірыч? — пачуўся чыйсьці мяккі голас.

— Ды, сказаць па праўдзе, не падабаюцца мне тыя жалуды, што ўрадзілі на зембінскіх дубах, — выдыхнуў Стэфан. — Дый смурод ад іх... фууух...

— Мёртвы вораг заўсёды прыемна пахне.

Прычыніўшы акно, Нямірыч павярнуўся на голас і, сустрэўшы пранізлівы погляд чорных, як вуголле, вачэй, падскочыў ад нечаканасці. Перад ім стаяў сам «дзядзілаўскі Д'ябал» і, крыва ўсміхаючыся, глядзеў на яго.

— Ну вось мы і сустрэліся, пан жартаўнік, — задаволена прамовіў разбойнік. — Я якраз збіраўся шукаць цябе па ўсёй Рэчы Паспалітай, а ты сам да мяне прыехаў. Дзякуй, што пазбавіў маіх людзей клопатаў.

— Дык гэта ты... пан Саковіч?! — здзіўлена спытаў Стэфан.

* Латуннымі.

** Бронзавыя.

*** Гатунак ціснёнай скуры.

**** Шыбы.

— Да тваіх паслуг, — прыязна адказаў гаспадар, свідруючы вачамі ворага.

Нямірыч таксама не зводзіў з яго вачэй. Нават у дзённым святле «Д'ябал» не пазбыўся свайго сатанінскага выгляду, і ад яго позірку, што апальваў пякельным агнём, у пана крайчага мароз па скуры пайшоў.

— Адкуль ты, пан падкаморы, ведаеш маё імя, ужо і на пошукі сабраўся? — нахмурыўся ён. — Няўжо дзядзілаўскі староста распавёў?

— Як ксяндзу на споведзі... перад смерцю, — кіўнуў разбойнік.

Стэфан зноў павярнуўся да мерцвякоў, спрабуючы пазнаць сярод іх знаёмы твар, але пан Саковіч толькі засмяяўся.

— Гэта казацкія разведчыкі, прысланыя сюды халопаў бунтаваць, — растлумачыў ён. — Аднак запэўніваю цябе, што нябожчык пан Грынкоўскі дабіраўся на той свет яшчэ цяжэй.

У Нямірыча ад такога гумару аж дыханне перахапіла:

— І ты так свабодна пра гэта кажаш?! За забойства шляхціца табе давядзецца перад судом адказаць! Ян Сабескі табе гэтага не даруе!

— Вясёлы ты чалавек, пан Нямірыч, — фыркнуў Саковіч. — Каб мяне ў суд прыцягнуць, ці табе, ці пану Сабескаму давядзецца добра пакапацца ў дзядзілаўскіх балотах, каб цела знайсці. Сам ведаеш, без гэтай дробязі мне ніякі суд нічога не зробіць*. Жадаю поспеху!

І развясёлы пан падкаморы падміргнуў Стэфану.

— Нічога сабе суддзя ў літоўскім Трыбунале**, — не ўтрымаўся той. — Цікава, ці ж князь Багуслаў ведае, якога падлюгу на службе трымае?

— Ты збіраешся засмуціць яго міласць непрыемнымі звесткамі? — прытворна занепакоіўся Саковіч. — Баюся, што не паспееш, шаноўны пане, ой не паспееш!

* Па судовых звычаях таго часу забойства магло быць даказана толькі пры наяўнасці цела забітага.

** Саковіч быў суддзёй Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага — найвышэйшага апеляцыйнага суда для літоўскай шляхты, які разглядаў грамадзянскія і крымінальныя справы. Суддзяў, агульнай колькасцю 46 чалавек, абіралі на шляхецкіх сойміках тэрмінам на чатыры гады.

Нямірыч разумеў, што разбойнік не жартуе, але пужацца і не думаў, таму што і сам быў не з заячай пароды. Да таго ж пан «Д'ябал» мяккім голасам і плаўнымі рухамі нагадаў яму кат́а — жывёлу хоць і драпежную, але ўсё ж не настолькі небяспечную, каб перад ёй дрыжаць.

— Няма чаго на мяне вылупліваццa, яснавяльможны пане, — абурыўся Стэфан, якога нахабства гаспадара ўжо пачало раздражняць. — Калі хочаш паядынку, то паводзь сябе, як належыць шляхціцу!

Саковіч ціха засмяяўся.

— Я бачу, табе не цярпіцца на той свет. Не спяшайся, дарагі мой, усяму свой час. У мяне такое правіла: перш за ўсё служба, а асабістае потым. Ты, здаецца, па справах сюды прыехаў?

Стэфан сумеўся.

— У мяне да цябе ліст ад князя канюшага літоўскага...

— Ну, давай сюды, — страпянуўся Адам і, прачытаўшы некалькі радкоў паслання, якое яму неахвотна ўручыў Нямірыч, зноў заліўся смехам: — Дык цябе, пан крайчы, Радзівіл пад маю руку прыставіў?! Ну Богусь, ну сябар, вось парадаваў Саковіча! Такі падарунак даслаў!

— Я князю не слуга, — пакрыўдзіўся Нямірыч. — Сам сюды прыехаў.

— Сам? — прамурлыкаў Адам, не зводзячы драпежнага позірку з госця. — Ну, дык яшчэ і лепш.

У Стэфана на душы пахаладзела ад яго сатанінскай усмешкі. А пан Саковіч, разваліўшыся ў крэсле, тым часам дачытваў пасланне. Але калі скончыў, выглядаў ужо трохі збянтэжаным.

— А скажы ты мне, шаноўны пане, за якія гэта такія заслугі Багуслаў загадвае аберагаць цябе «як зрэнку вока, каб і волас з галавы не ўпаў?» — пацікавіўся ён, ткнуўшы ліст пад нос Нямірычу.

— Пра гэта ты, пан падкаморы, самога князя і спытай, — адрэзаў Стэфан.

— Спытаю, не сумнявайся.

Пан Саковіч устаў, прайшоўся пакоем, пра нешта разважаючы, час ад часу кідаючы на госця цікаўныя погляды. Між тым

Нямірыч напружана разважаў, ці не азначае такі клопат Багуслава, што паганы характар слугі князю добра вядомы. У рэшце рэшт пан Адам стаміўся хадзіць і, спыніўшыся проста перад госцем, сказаў:

— Ну што, Нямірыч, загад ёсць загад, яго выконваць трэба. Войска ў мяне даўно гатова, таму заўтра выступаем. А сёння будзеш у мяне дарагім госцем. Адпачні з дарогі, а я слугам загадаю, каб выконвалі ўсе твае прыхамаці. Ці табе дзеўку для паслуг даслаць? — падміргнуў ён.

— Са сваімі дзеўкамі, пан падкаморы, сам забаўляйся, а мяне дома жонка чакае, — адмовіўся Стэфан.

Саковіч больш уважліва паглядзеў на яго.

— А скажы ты мне, шаноўны пане, даўно ты з хаты з’ехаў?

— Даўно, — уздыхнуў той. — А што?

— А тое, што паход не адзін месяц працягвацца будзе. Ты ўвесь гэты час жонцы вернасць будзеш захоўваць?

— Я на ўсё жыццё прысягаў перад богам і людзьмі...

Саковіч зарагатаў так, што прыбег слуга з пытаннем, ці не трэба чагосьці. Адсмяяўшыся, пан Адам адаслаў яго, загадаўшы накрываць на стол, а сам павярнуўся да Нямірыча.

— Ты пасля элекцыі каля Багуслава быў? — сказаў ён, выціраючы слёзы, што набеглі на вочы ад смеху.

— Так...

— Ого! — толькі і вымавіў Саковіч. — Калі ты ў такім таварystве не паразумнеў, то я пачынаю хваляваца за яго княжацкую міласць.

Нягледзячы на «цёплую» сустрэчу, вячэра прайшла прыемна, а сняданак яшчэ лепш, таму ў армію ворагі адправіліся ў добрым здароўі і настроі. Праўда, час ад часу Стэфан лавіў звернуты на яго д’ябальскі погляд гаспадара, але гэтымі позіркамі ўсё і абмежавалася. Увогуле пан Адам аказаўся добрым таварышам у доўгай дарозе: увесь час сыпаў жартамі, так што жаўнеры і сам пан Нямірыч аж жываты надрывалі ад смеху. Так даехалі да Мазыра — галоўнай крэпасці паўстанцаў на Палессі, куды Януш Радзівіл і накіраваў свае войскі.